І.А. МАРЗАЛЮК Я.Р. РЫЕР

# ГАРАДЗІШЧА ЗМЯЁЎКА (ПЕЛАГЕЕЎСКАЕ ГАРАДЗІШЧА) У МАГІЛЁВЕ

## Археалагічнае даследаванне



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя А.А. КУЛЯШОВА"

І.А. Марзалюк, Я.Р. Рыер

# ГАРАДЗІШЧА ЗМЯЁЎКА (ПЕЛАГЕЕЎСКАЕ ГАРАДЗІШЧА) У МАГІЛЁВЕ. АРХЕАЛАГІЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ЦЕНТР МГУ им. Кулешова
Магілёў 2010

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

УДК 902/904(476.4)
ББК 63.4(2Б)
М25

*Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-
выдавецкага савета УА «МДУ імя А.А.Куляшова»*

Р э ц э н з е н т ы:
доктар гістарычных навук загадчык кафедры гісторыі
Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта
*Ю.М. Бохан*;

доктар гістарычных навук загадчык Цэнтра гісторыі
даіндустрыяльнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі
*В.М. Ляўко*

**Марзалюк, І.А.**

М25 Гарадзішча Змяёўка (Пелагееўскае гарадзішча) у Магілёве. Археалагічнае даследаванне / І.А. Марзалюк, Я.Р. Рыер. — Магілёў: УА "МДУ імя А.А. Куляшова", 2010. — 68 с.: іл.

ISBN 978-985-480-598-6.

У даследаванні комплексна прааналізаваны матэрыялы, атрыманыя ў выніку археалагічных раскопак гарадзішча Змяёўка, большасць з якіх уведзена ў навуковы ўжытак упершыню.

Разлічана на навукоўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і навучэнцаў, краязнаўцаў — усіх тых, хто цікавіцца мінулым Беларусі.

Дадзенае даследаванне падрыхтавана ў рамках выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2006 — 2009 гг. "Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры".

**УДК 902/904(476.4)**
**ББК 63.4(2Б)**

**ISBN 978-985-480-598-6**

© Марзалюк І.А., Рыер Я.Г., 2010
© Афармленне.
УА "МДУ імя А.А. Куляшова", 2010

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# УВОДЗІНЫ

Гарадзішчы (умацаваныя паселішчы) на Магілёўшчыне, як і наогул ва Усходняй Еўропе, з'явіліся яшчэ ў раннім жалезным веку і адлюстроўвалі пачатак накаплення маёмасці ў першабытных плямёнаў, на якую пачалі квапіцца суседзі і якую, з гэтай нагоды, трэба было ахоўваць. Гарадзішчы сталі тым месцам, дзе хаваліся і самі жыхары падчас вайсковых нападаў. Але пастаянна жыць на ўмацаваных месцах было не вельмі прыдатна, бо валы і равы абцяжарвалі перагон жывёлы да пашы. Таму большасць паселішчаў заставалася без сталых умацаванняў. Нярэдка ўмацоўваліся абшчынныя і племянныя цэнтры, асабліва ў густанаселеных месцах. Ствараліся і ўмацаванні для часовых сховішчаў людзей і маёмасці. Вядомы і гарадзішчы-свяцілішчы — месцы, дзе выконваліся язычніцкія абрады. Але яны таксама былі без пастаянных жыхароў і, у адрозненне ад гарадзішч-сховішч і адзначаных цэнтраў, існавалі ў аддаленых месцах, сярод багнаў і лясоў.

Значнае павелічэнне колькасці гарадзішчаў на нашых землях пачалося з VII — VIII стст. н.э. У гэтым знайшлі адлюстраванне даволі актыўныя гістарычныя працэсы другой паловы першага тысячагоддзя ва ўсёй Усходняй і Цэнтральнай Еўропе: перамяшчэнні славянскіх плямёнаў на поўнач у лясныя балцкія і фіна-угорскія землі. Дадзеныя перамяшчэнні стымуляваліся як ростам насельніцтва, так і пачаткам выдзялення знаці ў плямёнах і стварэннем надплемянных аб'яднанняў для забеспячэння яе існавання. Пачасціліся ваенныя сутыкненні. Гэтыя працэсы і знайшлі яскравае адлюстраванне ў гістарычных лёсах першых жыхароў тых месцаў, дзе пазней узнік горад Магілёў.

У ваколіцах нашага горада сляды знаходжання людзей вядомы ўжо з эпохі мезаліту (каля 10 — 7 тыс. год да н.э.). Гэтыя сляды, як і стаянкі наступнага часу — неаліту і эпохі бронзы, — зафіксаваны даследчыкамі ў розных месцах па берагах Дняпра[1]. Паступова колькасць старажытных паселішчаў на тэрыторыі сучаснага Магілёва разрасталася. Але менавіта з-за будучай урбанізацыі большасць гэтых помнікаў не захавалася. Больш пашанцавала ўмацаванаму месцу амаль у сучасным цэнтры горада — ва ўрочышчы, званым калісьці *Пелагееўскім*, але больш вядомым як *Змяёўка*.

---

[1] Копытин В.Ф. Археологические памятники Могилева и окрестностей. — Могилев, 1993. — С. 10-16.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Гарадзішча Змяёўка, або Пелагееўскае, знаходзіцца на правым беразе р. Дубравенкі ў 2,5 км вышэй упадзення яе ў р. Днепр, на поўдзень ад праспекта Міру (мал. 1).

У звестках аб археалагічных помніках гарадзішча вядома з 1873 г. Першае яго апісанне належыць вядомаму археолагу, гісторыку, этнографу і краязнаўцу Е.Р. Раманаву, які адзначаў, што ў пачатку XX ст. гарадзішча мела два валы і равы, але вонкавыя роў і вал былі заараны яшчэ да 1905 г. (фота 1)[2]. Е.Р. Раманаў у 1905 г. правёў разведачную шурфоўку помніка, падчас якой даследчыкам былі адзначаны знаходкі ляпной керамікі, дадзена першая спроба апісання стратыграфіі помніка:

*"Змеевка находится на правом берегу речки Дубровенки, там, где она в ур. Пелагеевке входит в черту города. Змеевка составляет отрог правого высокого берега Дубровенки и есть ничто иное, как древнее городище. От материка берега городище отрезано с севера двумя рвами и валами, но наружный ров и первый вал уже запаханы. Второй ров в настоящее время имеет глубину до сажени, а головной вал вышину 2 саж. и ширину около 5 саж. Вершина городища представляет плоскую впадину глубиною около 1 арш. Вершина имеет овальную форму, длиною 12 саж., шир. 8. Спуски с горы с южной, восточной и западной стороны совершенно крутые и неприступные.*

*Пробные ямы на вершине дали слой чернозема в 2 четв., а на внутреннем скате вала в 2 арш. Из предметов найдены только раздробленныя кости животных, рыбья чешуя, уголья, сажа, камни и тонкие черепки с толченым кварцем, без орнамента. Никаких других следов культуры не найдено"*[3].

У 1928 і 1930 гг. гарадзішча аглядалі А.Н. Ляўданскі і В.Р. Тарасенка, у 1951 г. — Ю.В. Кухарэнка[4]. Але ніякіх работ яны не праводзілі. У пачатку 60-х гг. мінулага стагоддзя помнік разбураўся пры пракладцы праспекта Міру, а потым, з 1969 г., — у сувязі з будаўніцтвам комплексу Палаца піянераў. У выніку, калі ў 1969 г. пляцоўка гарадзішча займала 255 кв.м, на момант абследавання, якое ў ліпені 1973 г. распачаў Магілёўскі абласны краязнаўчы музей пад кіраўніцтвам Я.Р. Рыера, частка гарадзішча, якая захавалася, складала толькі 96,25 кв.м (мал. 1; фота 1-4). Раскопкі вяліся з 5 па 11 ліпеня 1973 г. студэнтамі гістарычнага факультэта Магілёўскага педінстытута.

---

[2] Романов Е.Р. Археологические разведки в Могилевской губернии // Отдельный оттиск из "Записок Северо-Западного отдела императорского русского географического общества". — Кн. 3. — Вильна, 1912. — С. 3.

[3] Романов Е.Р. Археологические разведки в Могилевской губернии. — Вильна, 1912. — С. 3.

[4] Копытин В.Ф. Археологические памятники Могилева и окрестностей. — Могилев, 1993. — С. 16.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Да моманту раскопак гарадзішча ўяўляла трохкутную пляцоўку, якая ўзвышалася над летнім узроўнем вады ў Дубравенцы на 15–16 м. Рэшткі вала (вышынёй 2 м) прымыкалі да заходняй часткі пляцоўкі. Роў перад унутраным валам ужо быў засыпаны. Частка вала, якая захавалася, падступала з захаду да гарадзішча і ўзвышалася над пляцоўкай менш чым на 2 м. З поўначы, усходу і поўдня пляцоўка гарадзішча была абмежавана стромкімі адхонамі, якія спрыялі яе інтэнсіўнаму разбурэнню.

Работы пачаліся з вызначэння ўмоў залягання і характару культурнага слоя. Я.Р. Рыерам была выканана зачыстка краёў пляцоўкі і вала на паўднёвым стромкім, адхонным баку. Даўжыня зачышчанага ўчастка – 21 м.

Акрамя гэтага, Я.Р. Рыер даследаваў 22 кв.м. культурнага слоя на самім помніку, зафіксаваў рэчавы матэрыял трох храналагічных перыядаў: кераміку верхнедняпроўскага варыянта кіеўскай культуры з штрыхоўкай і расчэсамі; матэрыялы калочынскай культуры трэцяй чвэрці першага тысячагоддзя н.э. і нешматлікія фрагменты ганчарнага посуду другой паловы X – XIII стст. Ім была выяўлена паўзямлянка каркасна-слупавой канструкцыі, знойдзены нож і два бронзавых бранзалеты з патоўшчанымі канцамі і геаметрычным арнаментам[5].

У III – IV стст. н.э. на тэрыторыі магілёўскага мікрарэгіёну існавала, сама меней, яшчэ два паселішчы кіеўскай культуры. Фрагменты гладкасценнай і ляпной керамікі з расчэсамі, з элементарнымі, адагнутымі вонкі венцамі III – IV стст. н.э. былі знойдзены І.А. Марзалюком пры даследаванні тэрыторыі колішняга магілёўскага замчышча, гары Магіла, падчас палявога сезона 2005 г.[6] Акрамя гэтага, у вярхоўях Дубравенкі, побач з вёскай Старое Пашкава, у працэсе археалагічных разведак 2009 г. тым жа даследчыкам быў выяўлены аналагічны керамічны матэрыял, рэпрэзентаваны грубай ляпной керамікай з расчэсамі і падштрыхоўкай. Па інфармацыі "чорнакапальнікаў", тут нібыта сустракаліся антычныя манеты III – IV стст. н.э. Е.Р. Раманаў паведамляў, што акрамя Пелагееўскага гарадзішча аналагічнае яму паселішча-гарадзішча існавала на тэрыторыі гары Магіла, але на момант яго разведак ужо было знішчана. Пры гэтым даследчык адзначаў знаходкі аналагічнай ляпной шурпатай керамікі ў правым адхонным беразе Дубравенкі, пад сценамі магілёўскага замчышча на гары Магіла:

*"Подобное же городище, но гораздо больших размеров имелось и на Валу, обращенном ныне в бульвар. Городище это в XVI в. было*

---

[5] Риер Я.Г. Отчет об археологических работах в Могилевской области в 1973 г. – Могилев, 1974. – С. 18-28 // Архіў Інстытута гісторыі НАНБ. – № 429.

[6] Марзалюк І.А. Справаздача аб археалагічных раскопках Пелагееўскага гарадзішча (Змяёўка) у г. Магілёве ў 2008 г. – Магілёў, 2009 // Архіў Інстытута гісторыі НАНБ. – № 2593.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*утилизировано для постройки польского королевского замка и никаких следов от него не сохранилось; лишь на обрыве реки Дубровенки здесь находятся массивные необожженные черепки, такой же конструкции, как и Змеевские, но более толстые*"[7].

Пакуль што ні ў працэсе нашых разведак, ні пры стацыянарных раскопках артэфактаў V – VII стст. на тэрыторыі гары Магіла і правабярэжжа Дубравенкі, якое да яе прылягае, на жаль, не знойдзена.

Са згоды спадара Я.Р. Рыера сааўтар гэтай кнігі, І.А. Марзалюк, атрымаў дазвол на працяг вывучэння культурнага слоя Змяёўкі. Археалагічны атрад гістарычнага факультэта МДУ імя А.А. Куляшова ў ліпені – кастрычніку 2008 г. праводзіў археалагічныя раскопкі на гэтым помніку. Атрад быў сфарміраваны на базе студэнтаў 1–3 курсаў гістарычнага факультэта ў колькасці 30 чалавек, якія з'яўляліся лабарантамі, дапамагалі пры ажыццяўленні археалагічнага нагляду, выкананні графічнай фіксацыі профіляў і камеральнай апрацоўцы матэрыялу.

Выкананне прац было абумоўлена планавымі даследаваннямі аўтараў па вывучэнні сістэмы рассялення жыхароў Верхняга Падняпроўя ў эпоху жалезнага веку і сярэднявечча. Галоўнай мэтай даследаванняў было вывучэнне культурнага слоя гарадзішча і яго ўмацаванняў.

Кіраўніцтва археалагічнымі раскопкамі ў 2008 г. ажыццяўляў загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін доктар гістарычных навук І.А. Марзалюк (дазвол № 1908 па форме № 1, выда-дзены ДНУ "Інстытут гісторыі НАН Беларусі" 13.05.08). Першапачаткова планавалася здзейсніць толькі прарэзку знешняга вала гарадзішча. Але вывучэнне вала паказала, што ўпрытык да яго размешчана некранутае жытло – паўзямлянка калочынскай культуры з печкай-каменкай у куце. Таму намі было прынята рашэнне аб распрацоўцы яшчэ і раскопу, каб цалкам вывучыць гэтае жытло. У ходзе даследаванняў 2008 г. у межах раскопу былі выяўлены яшчэ адна паўзямлянка і дзве гаспадарчыя ямы.

Такім чынам, агульная плошча вывучанага культурнага слоя на ацалелай рэшце гарадзішча складае 70 кв.м.

І.А. Марзалюк выказвае падзяку дырэкцыі Магілёўскага абласнога музея імя Е.Р. Раманава (асабіста дырэктару музея Віктару Мікалаевічу Аненкаву і вучонаму сакратару музея Анатолію Аляксеевічу Седзіну) за магчымасць выкарыстаць для параўнальнага аналізу керамічны посуд з Абідні, які захоўваецца ў фондах музея і выстаўлены ў яго экспазіцыі, з уласнымі знаходакамі .

---

[7] Романов Е.Р. Археологические разведки в Могилевской губернии // Отдельный оттиск из "Записок Северо-Западного отдела императорского русского географического общества". – Кн. 3. – Вильна, 1912. – С. 3.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Аўтары лічаць таксама сваім абавязкам выказаць шчырую падзяку сябрам часовага навуковага калектыву "Археолаг"; студэнту гістарычнага факультэта МДУ імя А.А. Куляшова Дзянісу Васількову, які выканаў высакаякасную фотафіксацыю раскопак 2008 г. і рэчавага матэрыялу; Аляксею Аўласовічу за дапамогу ў вядзенні палявой дакументацыі ў працэсе даследаванняў і камеральнай апрацоўкі знаходак. Кніга шмат страціла б без высакаякаснай графічнай фіксацыі і замалёвак профіляў, планаў раскопаў, знаходак, дапрацоўкі фотаматэрыялаў з табліцамі артэфактаў, выкананых лабарантам кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Раманам Мазурам і студэнтам гістарычнага факультэта, сябрам часовага навуковага калектыву "Археолаг" Ільёй Дольскім.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Раздзел 1. СТРАТЫГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПОМНІКА

## 1.1. Зачыстка краёў пляцоўкі і вала на паўднёвым баку гарадзішча (1973 г.)

Работы пачаліся з вызначэння ўмоў залягання і характару культурнага слоя. Была зроблена зачыстка краёў пляцоўкі і вала на паўднёвым адхонным баку гарадзішча (профіль па лініі $AA_1$ (мал. 1; мал. 2:1; фота 5)). Даўжыня зачышчанага ўчастка – 21 м. Да захаду ад адзнакі 16 м (вышыня над узроўнем Дубравенкі) усе пласты профілю разразае запоўнены зямлёй перакоп, які даходзіць амаль да мацерыка. Зверху залягае самы магутны пласт цёмна-шэрага колеру, месцамі амаль чорнага, з гумусіраваным дзірваном. Ва ўсходняй частцы профілю ён мае таўшчыню 0,6–0,8 м, у цэнтральнай частцы (частка пляцоўкі, якая прымыкае да вала) – 0,4–0,9 м, у заходняй частцы (вал) – 1–1,1 м. У цэнтральнай частцы профілю (паміж лініямі $ББ_1$ і $ВВ_1$) у гэтым пласце сустракалася вуголле.

Пад пластом цёмна-шэрага колеру ва ўсходняй частцы профілю залягае пласт попелу таўшчынёй 0,1–0,15 м, пад ім пачынаецца мацерыковая гліна. Каля ўсходняга ўскрайку профілю пласт цёмна-шэрага колеру непасрэдна кантактуе з мацерыком. На захад ад гэтага кантакту паміж пластом попелу і пластом цёмна-шэрага колеру назіраецца праслойка напаленага пяску магутнасцю 0,06–0,1 м.

У цэнтральнай частцы профілю пад пластом цёмна-шэрага колеру залягае карычневы пласт, які складаецца з драўніннага тлену, перамешанага з пяском, попелам і камякамі гліны, магутнасцю 0,5 м каля сценкі перакопу. Яго таўшчыня павялічваецца ў заходнім накірунку. Ніжэй залягае праслойка напаленага пяску, перарэзаная на ўсходзе перакопам. Гэтая праслойка мае даўжыню 4,8 м і магутнасць 0,05–0,08 м. Пад ёй залягае пласт попелу з вугалем магутнасцю 0,1–0,2 м. Ён ляжыць на мацерыку.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У заходняй частцы профілю, у пласце цёмна-шэрага колеру, назіраецца праслойка попельнай супескі магутнасцю да 0,2 м. Пад пластом цёмна-шэрага колеру залягае пласт попелу магутнасцю 0,2–0,4 м, падзелены каля заходняга ўскрайку профілю праслойкай суглінку таўшчынёй 0,2–0,25 м. З заходняга боку профілю пад попельным пластом залягае мацярык. На адлегласці 4,5 м ад заходняга кута зачышчанага профілю мацярык рэзка апускаецца на глыбіню больш 1 м і пад попельным пластом з'яўляецца апісаны вышэй карычневы пласт магутнасцю ад 0,7 да 1 м. У гэтым пласце сустракаюцца праслойкі гліны і суглінку. Пад ім залягае тонкі попельны пласт магутнасцю да 0,1 м, які ідзе з усходняга боку профілю.

## 1.2. Апісанне стратыграфіі раскопаў (1973 г.)

Пасля вывучэння вынікаў зачысткі ўшчыльную да яе быў закладзены раскоп № 1 памерамі 16 кв.м. (4 х 4 м) (мал. 1; мал. 2:2; фота 6). Раскоп быў закладзены каля вала. На поўнач ад раскопу № 1, праз 1 м, быў закладзены раскоп № 2 (3 х 2 м) (мал. 1; мал. 3:1).

Раскопы былі падзеленыя на квадраты з бакамі даўжынёй у 1 м. Выбарка слоя праводзілася пластамі таўшчынёй 0,2 м з люстранай зачысткай пасля кожнага знятага пласта.

У працэсе даследаванняў стала зразумела, што верхняя частка культурнага слоя пляцоўкі часткова парушана, бо ў верхнім пласце ў розных месцах абодвух раскопаў былі знойдзены фрагменты грубаляпной керамікі разам з кавалкамі сучаснай цэглы (у межах пласта № 1). Як высветлілася пазней, у 50-я гг. ХХ ст., магілёўская гарадская камунальная гаспадарка ў мэтах умацавання гарадзішча рабіла на ім падсыпкі з чарназёму, якія суправаджаліся ў асобных месцах пераворваннем верхняга пласта пляцоўкі.

У *раскопе № 2* пад пластом цёмна-шэрага колеру (магутнасцю 0,3–0,5 м) знаходзіўся пласт пяску на мацерыковай гліне (мал. 3:1). У пласце цёмна-шэрага колеру было сабрана 12 фрагментаў грубаляпной керамікі, фрагмент венца кругавога гаршка, шлак. Ляпную кераміку можна падзяліць на дзве групы:

1) з дамешкай дробназярністага пяску і жарствы, шурпатай паверхняй, месцамі са слабай штрыхоўкай, у тым ліку фрагмент



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тулава гаршка з выразным рабром (усе фрагменты першай групы (5 чарапкоў) знойдзены ў верхнім, цёмна-шэрым, пласце раскопу).

2) сценкі з дамешкай буйных зерняў жарствы, бугрыстай паверхняй, у тым ліку фрагмент прамога венца са зрэзаным краем.

Кераміка першай групы мае прамыя аналагі ў керамічным комплексе з эталоннага помніка верхнедняпроўскага варыянта кіеўскай культуры — Абідні і можа быць прадатавана канцом II — IV стст.[1] Кераміка другой групы ідэнтычная па тэхніцы выканання керамічным комплексам трэцяй чвэрці першага тысячагоддзя н.э. і можа быць датавана V — VII стст. н.э.[2]

У ***раскопе № 1*** у верхнім пласце цёмна-шэрага колеру было знойдзена 27 фрагментаў грубаляпной керамікі і жалезны нож з прамой спінкай (частка тронка абламаная). Кераміка аналагічная кераміцы другой групы з раскопу № 2. Керамічны матэрыял рэпрэзентаваны ў асноўным знаходкамі сценак, але таксама было знойдзена два фрагменты венцаў, адно з якіх мае крыху адагнуты закруглены вонкавы край, другое — адагнуты край і выразна выяўленае рабро на плечуку. Магутнасць пласта цёмна-шэрага колеру складае 0,4—1 м. Найбольшую магутнасць гэты пласт мае ў заходнім баку раскопу, бліжэй да вала (мал. 2:2; фота 6). Пад ім залягае апісаны вышэй карычневы пласт. Толькі ў паўночнай сценцы раскопу ў кв. Г-1, Г-2, Г-3 і Г-4 адразу пад цёмна-шэрым пластом выяўлены мацярык.

У кантакце пласта цёмна-шэрага колеру з карычневым на мяжы кв. Б-1 і Б-2 на глыбіні 0,7 м былі знойдзены два бронзавыя бранзалеты з патоўшчанымі канцамі і геаметрычным арнаментам, сашчэпленыя паміж сабой (мал. 12:1,2).

---

[1] Ильютик А.В. Поселение Абидня. Постройки 1, 2, 4, 5 // Верхнее Поднепровье и Подвинье в III — V веках н. э. Раннеславянский мир. — № 4. — Москва, 2002. — С. 54-74; Ильютик А.В., Поболь Л.Д. Керамика Абидни // Памятники эпохи железа и средневековья Беларуси. К 60-летию О.Н. Левко. Материалы по археологии Беларуси. — № 14. — Мн., 2007. — С. 18-36.

[2] Макушников О.А. Раннесредневековая керамика городища Колочин I на Гомельщине // Ранние славяне Белорусского Поднепровья и Подвинья. — Мн., 2003. — С. 217-233.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Карычневы пласт, які памяншаецца і знікае ў паўночнай частцы раскопу, патаўшчаецца да поўдня, дзе яго магутнасць дакодзіць да 0,5—0,7 м. У гэтым пласце на глыбіні 0,5—0,8 м у кв. В-1, Б-1, Б-2, А-2 і Б-4 знойдзены фрагменты керамікі, аналагічныя знойдзеным вышэй, у цёмна-шэрым пласце.

Пад карычневым пластом, у кв. А-1, А-2, А-3, А-4, Б-1, Б-2, Б-3, В-1, В-2, Г-1 і Г-2, на глыбіні 0,9—1 м адзначана праслойка напаленага пяску магутнасцю 0,05—0,08 м, якая ляжала на пласце попелу. У кв. Б-4, Б-3, В-4, Г-3, Г-4 попельны пласт залягае на розных глыбінях (ад 0,5 да 1,1 м) непасрэдна пад напластаваннямі карычневага колеру (мал. 2:2; фота 6).

Попельны пласт магутнасцю 0,08—0,12 м у кв. Г-1, Г-2, Г-3, Г-4, В-4, Б-4, А-3 і А-4 залягае вышэй, чым у астатніх, і на глыбіні 0,6—0,7 м пад ім знаходзіцца мацярык. У астатніх жа квадратах раскопу пад попельным пластом зноў назіраецца карычневы пласт, які мае магутнасць да 0,2—0,25 м. Ён утварае ў плане пляму з выразнымі межамі, добра прыкметную на малюнку і фотаздымку. На гэтым жа малюнку бачны круглыя ямы — вычышчаныя сляды абгарэлых слупоў (мал. 3:2; фота 6). На фота бачны першапачатковыя памеры раскопу №1 — 3 х 3 м.

Пры выбарцы грунту з вышэйадзначанага пласта было сабрана 14 фрагментаў керамікі, якая адпавядае па сваіх характарыстыках кераміцы другой групы з раскопу №2.

Ніжняя частка апісанага пласта, якая ляжала непасрэдна на мацерыковым грунце, значна шчыльней астатніх культурных напластаванняў і мала адрозніваецца па шчыльнасці ад мацерыка. Верагодна, гэта была падлога паўзямляначнага жытла каркасна-слупавой канструкцыі, усходняя або паўночна-ўсходняя частка якога выяўлена раскопам (гл. мал. 3:2, план зачысткі на ўзроўні мацерыка). Мяжа жытла адпавядае мяжы плямы карычневага пласта. Выразна прасочваюцца ямы ад слупоў розных памераў (фота 6).

Попельны пласт месцамі ляжаў на карычневым, месцамі перасякаў яго. Ён займаў у плане большую, чым карычневы пласт, плошчу і застаўся, верагодна, ад пажару (аб гэтым ніжэй).

***Апісанне профіляў раскопу № 2*** (мал. 3:1).

***Заходні профіль***: сучасная дзённая паверхня паніжаецца ад поўдня на поўнач на 0,3 м; пласт цёмна-шэрага колеру мае магутнасць 0,8—0,95 м; пад ім ад паўднёвага боку да сярэдзіны сценкі залягае попельны пласт № 1 магутнасцю 0,1—0,12 м; ніжэй

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

знаходзіцца карычневы пласт магутнасцю ад 0,7 м на паўднёвым баку да 0,1 м на паўночным баку; пад ім — пласт попелу №2 магутнасцю 0,08—0,1 м; ніжэй, на паўднёвым баку сценкі, — мацярык, які ад сярэдзіны да паўночнага боку паступова ўздымаецца на 0,4 м і змыкаецца з мацерыком на паўночным баку сценкі. Пад попельным пластом у паўночнай частцы сценкі зноў залягае карычневы пласт магутнасцю да 0,4 м, ніжэй — мацерыковы грунт, размешчаны з паўднёвага боку на глыбіні 2 м, а ў паўночным, дзе змыкаецца з пластом цёмна-шэрага колеру, — на глыбіні 0,8 м. У цэнтральнай частцы сценкі, там, дзе попельны пласт № 2 пачынае ўздымацца, мацярык крыху паглыбляецца, а затым да паўночнага боку рэзка ўздымаецца. Дадзенае паглыбленне, напэўна, зроблена штучна. На профілі $ГГ_1$ назіраецца звужэнне паказанага паглыблення (верагодна, падлогі жытла).

***Паўночны профіль.*** Сучасная дзённая паверхня апускаецца з захаду на ўсход на 1 м; ніжэй залягае цёмна-шэры пласт магутнасцю 0,4—0,9 м, пад ім — мацярык. Вялікую цікавасць уяўляе профіль $ДД_1$ (профіль паўночнай сценкі раскопу), які перасякае культурны пласт. Магутнасць пласта цёмна-шэрага колеру ў ім — 0,3—0,8 м, на ўсходнім баку сценкі ён кантактуе з мацерыком, у астатніх частках сценкі пад ім залягае карычневы пласт магутнасцю 0,05—0,2 м. У заходняй частцы сценкі паміж паказанымі вышэй пластамі знаходзіцца праслойка попельнай супескі магутнасцю да 0,15 м; пад карычневым пластом залягае пласт попелу з вугалямі магутнасцю 0,05—0,1 м, які адпавядае попельнаму пласту № 2 заходняй сценкі; у большай частцы сценкі паказаны попельны пласт ляжыць на мацерыку, і толькі бліжэй да яе заходняга боку пад ім на паглыбленым мацерыку знаходзіцца карычневы пласт. Дадзенае паглыбленне таксама, верагодна, з'яўляецца падлогай жытла. Мацярык у кропцы Д знаходзіцца на глыбіні 1,5 м, у кропцы $Д_1$, дзе ён сустракаецца з падлогай, — на глыбіні 0,5 м.

***Усходні профіль.*** Сучасная дзённая паверхня ўздымаецца з поўначы на поўдзень на 0,5 м. Пласт цёмна-шэрага колеру магутнасцю 0,4—0,5 м у паўночнай палове сценкі ляжыць на мацерыку, у паўднёвай — на карычневым пласце, магутнасць якога 0,05—0,4 м, пад ім, на мацерыку, залягае попельны пласт з вугалямі магутнасцю 0,05—0,2 м, аналагічны попельнаму пласту № 2 заходняй сценкі раскопу. Глыбіня залягання мацерыка каля паўночнага боку сценкі — 0,4 м, каля паўднёвага — 1,1 м.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## 1.3. Агульная характарыстыка стратыграфіі траншэі № 1 (2008 г.)

Траншэя № 1 была закладзена з мэтай вывучэння ўмацаванняў старажытнага гарадзішча. Траншэя прарэзала вал напалову (квадраты ішлі ад грэбеня вала і злучаліся з пляцоўкай гарадзішча). Вал не быў прарэзаны наскрозь толькі па адной прычыне: не хацелася псаваць яго форму са знешняга боку (мал. 1; мал. 4; мал. 5; фота 7-9).

Верхняя частка вала — апошняя падсыпка ўмацаванняў, якая была здейснена ўжо ў старажытнарускі перыяд, аб чым сведчаць адзінкавыя фрагменты кругавой керамікі гэтага часу. У якасці падсыпкі быў выкарыстаны культурны слой гарадзішча. Аб гэтым сведчыць зафіксаваны рэчавы матэрыял — кераміка V — VII стст., а таксама больш познія фрагменты кругавога посуду (сценкі гаршкоў), структура слоя — цёмна-шэры колер з дамешкамі вугалю і попелу.

Пасля гэтага пачынае ісці ядро вала, якое складаецца з гліны светлага колеру. У межах квадратаў 1—3, з глыбіні 0,9—1 м, пачынаюць прасочвацца рэшткі спаленых умацаванняў гарадзішча — спарахнелыя бярвёны лагаў сцяны, яма ад спаленага слупа (з глыбіні 1,6 м ад дзённай паверхні, кв. 2) (мал. 5:1,2; фота 7). Сляды вялікага пажару выразна прасочваюцца на паўночным і паўднёвым профілях траншэі ў выглядзе суцэльных праслоек вугалю, максімальная магутнасць асобных праслоек — 0,37—0,4 м (мал. 4:1—3). У напластаваннях пажарышча фіксавалася тыповая для трэцяй чвэрці першага тысячагоддзя н.э. кераміка. У межах квадрата № 3, у пласце № 5, зафіксаваны два бронзавыя бранзалеты з геаметрычным арнаментам V — VII стст., аналагічныя знойдзеным раней, у 1973 г., Я.Р. Рыерам. Яны таксама былі сашчэпленыя паміж сабой, як і знаходкі з раскопак 1973 г. (мал. 12:4,5; фота 16:1,2). Такім чынам, гэта ўжо другі скарб-паклад, які, магчыма, быў пакінуты або схаваны паміж кутам жытла і падэшвай вала падчас штурму гарадзішча.

Пасля гэтага на профілях траншэі пачынае ісці мацерыковая марэнная гліна. Выключэнне складае стратыграфія квадрата № 4. У межах квадрата № 4 былі зафіксаваны рэшткі жытла паўзямлянкі з абваленым гліняным дахам, фрагмент апечка печы-каменкі. Было вырашана гэты квадрат да канца не распрацоўваць,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

апечак не кранаць і з мэтай паўнавартаснага даследавання жытла разбіць раскоп, у межы якога павінен быў увайсці і квадрат № 4, што і было зроблена (мал. 5:3; фота 8, 9).

***Стратыграфічная характарыстыка паўночнага профілю*** (мал. 4:1)

*Гумус.* Максімальная магутнасць — 0,22 м, мінімальная — 0,05 м, сярэдняя — 0,135 м.

***Напластаванні***

*Гліна ярка-чырвонага колеру (абвалены дах паўзямлянкі, у межах квадрата 4).* Максімальная магутнасць — 0,05 м, мінімальная — 0,03 м, сярэдняя — 0,04 м.

*Слой цёмна-шэрага колеру.* Максімальная магутнасць — 1,36 м, мінімальная — 0,19 м, сярэдняя — 0,775 м.

*Гліна светла-чырвонага колеру.* Максімальная магутнасць — 0,61 м, мінімальная — 0,15 м, сярэдняя — 0,38 м.

*Агульная магутнасць слоя.* Максімальная магутнасць — 2,25 м, мінімальная — 0,92 м, сярэдняя — 1,585 м.

***Стратыграфічная характарыстыка паўднёвага профілю*** (мал. 4:3)

*Гумус.* Максімальная магутнасць — 0,14 м, мінімальная — 0,06 м, сярэдняя — 0,1 м.

***Напластаванні***

*Гліна ярка-чырвонага колеру (абвалены дах паўзямлянкі, у межах квадрата 4).* Максімальная магутнасць — 0,16 м, мінімальная — 0,03 м, сярэдняя — 0,095 м.

*Слой цёмна-шэрага колеру.* Максімальная магутнасць — 1,13 м, мінімальная — 0,39 м, сярэдняя — 0,76 м.

*Гліна светла-чырвонага колеру.* Максімальная магутнасць — 1,01 м, мінімальная — 0,13 м, сярэдняя — 0,57 м.

*Агульная магутнасць слоя.* Максімальная магутнасць — 1,78 м, мінімальная — 1,07 м, сярэдняя — 1,425 м.

***Стратыграфічная характарыстыка ўсходняга профілю*** (мал. 4:2)

*Гумус.* Максімальная магутнасць — 0,25 м, мінімальная — 0,08 м, сярэдняя — 0,165 м.

***Напластаванні***

*Гліна ярка-чырвонага колеру (абвалены дах паўзямлянкі, у межах квадрата 4).* Максімальная магутнасць — 0,19 м, мінімальная — 0,04 м, сярэдняя — 0,115 м.

*Слой цёмна-шэрага колеру.* Максімальная магутнасць — 0,6 м, мінімальная — 0,51 м, сярэдняя — 0,555 м.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

*Гліна светла-чырвонага колеру.* Максімальная магутнасць – 0,26 м, мінімальная – 0,2 м, сярэдняя – 0,23 м.

*Агульная магутнасць слоя.* Максімальная магутнасць – 1,13 м, мінімальная – 0,92 м, сярэдняя – 1,025 м.

***Стратыграфічная характарыстыка заходняга профілю*** (мал. 4:4)

*Гумус.* Максімальная магутнасць – 0,12 м, мінімальная – 0,05 м, сярэдняя – 0,085 м.

***Напластаванні***

*Слой цёмна-шэрага колеру.* Максімальная магутнасць – 0,69 м, мінімальная – 0,43 м, сярэдняя – 0,56 м.

*Гліна светла-чырвонага колеру.* Максімальная магутнасць – 1,02 м, мінімальная – 0,86 м, сярэдняя – 0,94 м.

*Агульная магутнасць слоя.* Максімальная магутнасць – 1,68 м, мінімальная – 1,57 м, сярэдняя – 1,595 м.

## 1.4. Агульная характарыстыка стратыграфіі раскопу № 3 (2008 г.)

Стратыграфічная характарыстыка раскопу даволі простая (мал. 6). Пасля дзірвану з гумусіраваным пластом глебы па ўсёй плошчы раскопу назіраецца культурны слой цёмна-шэрага колеру, насычаны вугалем і артэфактамі пераважна V – VII стст. У межах першага пласта, як правіла непасрэдна ў дзірване і ў межах кантакту дзірвану з культурным слоем цёмна-шэрага колеру, былі зафіксаваны найбольш позція знаходкі – кавалкі цэглы савецкіх часоў, гільзы ад дробнакаліберная вінтоўкі, фрагменты керамікі XVII ст., манета "лускавінка" часоў маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча.

У верхняй частцы слоя цёмна-шэрага колеру таксама сустракаліся адзінкавыя фрагменты кругавой керамікі старажытнарускага часу (сценкі). Аднак асноўная колькасць знаходак, паўторымся, з гэтага гарызонта рэпрэзентавана старажытнасцямі V – VII стст. Старажытнасці III – IV стст. стратыграфічна не вылучаюцца. Адзінкавыя матэрыялы III – IV стст. фіксаваліся ў 1-м пласце, але ў пераважнай большасці выпадкаў – у ніжняй частцы гарызонта з напластаваннямі цёмна-шэрага колеру (гл. ніжэй калекцыйныя вопісы). Пасля выбаркі гэтых напластаванняў назіраецца мацерыковая марэнная гліна. Выключэнне складае стратыграфічная сітуацыя ў межах квадратаў 2 і 7, часткова 3 і 8. Тут размешчана



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

жытло № 1 – паўзямлянка каркасна-слупавога тыпу (мал. 7:1, 2; фота 10, 11). Жытло № 2 размешчана ў межах квадратаў 3, 4, часткова 8, 9. У гэтых квадратах таксама чыталіся рэшткі яшчэ адной(?) паўзямлянкі каркасна-слупавога тыпу (мал. 7:1, 2; фота 12, 13, 14). Характар рэчавага запаўнення катлаванаў паўзямлянак дазваляе датаваць гэтае жытло трэцяй чвэрцю першага тысячагоддзя н.э. Побач з імі былі знойдзены заглыбленыя ў мацярык гаспадарчыя ямы з рэшткамі перапаленага збожжа (гл. ніжэй апісанне жытла і гаспадарчых ям).

***Стратыграфічная характарыстыка паўночнага профілю*** (мал. 6:4)

*Гумус.* Максімальная магутнасць – 0,1 м, мінімальная – 0,05 м, сярэдняя – 0,075 м.

***Напластаванні***

*Слой цёмна-шэрага колеру.* Максімальная магутнасць – 0,63 м, мінімальная – 0,11 м, сярэдняя – 0,37 м.

*Гліна чырвонага колеру.* Максімальная магутнасць – 0,52 м, мінімальная – 0,026 м, сярэдняя – 0,273 м.

*Агульная магутнасць слоя.* Максімальная магутнасць – 1,03 м, мінімальная – 0,32 м, сярэдняя – 0,675 м.

***Стратыграфічная характарыстыка паўднёвага профілю*** (мал. 6:2)

*Гумус.* Максімальная магутнасць – 0,12 м, мінімальная – 0,04 м, сярэдняя – 0,08 м.

***Напластаванні***

*Слой цёмна-шэрага колеру.* Максімальная магутнасць – 0,93 м, мінімальная – 0,06 м, сярэдняя – 0,495 м.

*Гліна чырвонага колеру.* Максімальная магутнасць – 0,57 м, мінімальная – 0,02 м, сярэдняя – 0,295 м.

*Агульная магутнасць слоя.* Максімальная магутнасць – 1,23 м, мінімальная – 0,54 м, сярэдняя – 0,885 м.

***Стратыграфічная характарыстыка ўсходняга профілю*** (мал. 6:1)

*Гумус.* Максімальная магутнасць – 0,082 м, мінімальная – 0,026 м, сярэдняя – 0,054 м.

***Напластаванні***

*Слой цёмна-шэрага колеру.* Максімальная магутнасць – 0,42 м, мінімальная – 0,05 м, сярэдняя – 0,235 м.

*Гліна чырвонага колеру.* Максімальная магутнасць – 0,39 м, мінімальная – 0,06 м, сярэдняя – 0,225 м.

*Слой цёмна-шэрага колеру.* Максімальная магутнасць – 0,43 м, мінімальная – 0,03 м, сярэдняя – 0,23 м.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Гліна чырвонага колеру.* Максімальная магутнасць — 0,06 м, мінімальная — 0,014 м, сярэдняя — 0,037 м.

*Агульная магутнасць слоя.* Максімальная магутнасць — 1,97 м, мінімальная — 0,33 м, сярэдняя — 0,65 м.

***Стратыграфічная характарыстыка заходняга профілю*** (мал. 6:3)

*Гумус.* Максімальная магутнасць — 0,13 м, мінімальная — 0,03 м, сярэдняя — 0,08 м.

*Перакоп (траншэя № 1, былы квадрат 4).* Максімальная магутнасць — 1,31 м, мінімальная — 1,1 м, сярэдняя — 1,205 м.

***Напластаванні***

*Слой цёмна-шэрага колеру.* Максімальная магутнасць — 0,88 м, мінімальная — 0,12 м, сярэдняя — 0,5 м.

*Гліна чырвонага колеру.* Максімальная магутнасць — 0,95 м, мінімальная — 0,21 м, сярэдняя — 0,58 м.

*Агульная магутнасць слоя.* Максімальная магутнасць — 1,49 м, мінімальная — 1,03 м, сярэдняя — 1,26 м.

## 1.5. Апісанне жытла і мацерыковых ям

***Раскоп № 1. (1973 г.).*** Мяжа жытла адпавядае мяжы плямы карычневага пласта ў межах раскопу. Ямы ад слупоў былі рознымі (мал. 3:2; фота 6). Ямы №№ 1 2, 7, 10 — дробныя (глыб. 0,05—0,25 м), з плоскім дном, круглыя, з адносна вялікім дыяметрам (0,35—0,5 м); ямы №№ 3—6 — глыбокія (0,35—0,5 м), з конусападобным дном, круглыя, з адносна невялікім дыяметрам (0,2—0,3 м). Яма № 9 — квадратная, дробная (глыб. 0,2 м), з плоскім дном. Яма № 8 — дробная (глыб. 0,05 м), з плоскім дном і малым дыяметрам (0,2 м). Відавочна, слупы, ад якіх засталіся ямы №№ 3—6, былі значныя па даўжыні і неслі высокія лёгкія канструкцыі жытла. Слупы ж, чые сляды захаваліся ў ямах №№ 1, 2, 7 і 10, былі апорамі пад цяжкімі часткамі пабудовы. Ямы №№ 8 і 9 засталіся, верагодна, ад слупоў, якія неслі падстрэшкі, бо сляды вакол гэтых ям не прасочаны.

Жытло гэта, якое знаходзілася з унутранага боку вала, было, верагодна, паўзямлянкай, урэзанай у мацярык, нахілены да ракі. Усходнім бокам яна была паглыблена ў мацярык толькі на 5—10 см, заходнім — больш чым на 1 м, што добра прасочваецца на профілі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

$AA_1$ (мал. 2:1). Жытло, відаць, было выцягнута з паўднёвага захаду на паўночны ўсход на 6–6,5 м. У сценках жытла, па ўсіх дадзеных, ужывалася гліняная абмазка, сляды якой у выглядзе камячкоў гліны сустракаліся паўсюдна ў так званым "карычневым пласце", які ўтварыўся з рэшткаў драўляных будынкаў жытла (драўнінны тлен), арганічных рэшткаў (попел, часцінкі перагною) і навакольнага грунту (пясок).

***Раскоп № 3 (2008 г.)***

***Паўзямлянка №1.*** У межах квадратаў 2 і 7, часткова 3 і 8, размешчана жытло – паўзямлянка каркасна-слупавога тыпу (мал. 7: 1,2; фота 10, 11). Жытло мае наступныя памеры: з поўначы на поўдзень – 2,61 м, з усходу на захад – 4 м. З усходу размяшчаўся ўваход у паўзямлянку ў выглядзе прыямка, які выступае за перыметр катлавана, шырынёй 0,49 м. У заходняй частцы жытла назіраюцца рэшткі печы-каменкі наступных памераў: з поўначы на поўдзень – 1,78 м, з захаду на ўсход – 2,03 м. Рэшткі печы-каменкі ў выглядзе скаплення абгарэлых камянёў і пясчана-вуглістага пласта.

Запаўненне жытла – культурны слой цёмна-шэрага колеру, насычаны вугалем, керамікай, паасобнымі косткамі жывёл.

Падлога жытла знівеліраваная і ўтрамбаваная, пры падчыстцы падлогі зафіксаваны рэшткі глінянай падмазкі.

У паўднёвым накірунку, у межах квадрата 1, намі былі выяўлены дзве гаспадарчыя ямы, што знаходзіліся побач з жытлом. Пры іх выбарцы было знойдзена абвугленае зерне.

**Гаспадарчая яма № 1** мае прамавугольную форму памерамі 0,41 х 0,86 м, глыбінёй 0,26 м. Сценкі з марэннай, злёгку абпаленай гліны чырвонага колеру. Запаўненне цёмна-шэрага колеру, насычанае вугалем і зернем (мал. 7:1,2).

**Гаспадарчая яма № 2** мае прамавугольную форму памерамі 0,76 х 0,8 м, глыбінёй 0,7 м. Сценкі з марэннай, злёгку абпаленай гліны чырвонага колеру. Запаўненне цёмна-шэрага колеру, насычанае вугалем і зернем (мал. 7:1, 2).

***Паўзямлянка № 2.*** У межах квадратаў 3, 4, часткова 8, 9, назіраліся рэшткі яшчэ аднаго жытла – паўзямлянкі каркасна-слупавога тыпу (мал. 7:1, 2; фота 12, 13, 14). Жытло мае наступныя памеры: з поўначы на поўдзень – 3,30 м, з усходу на захад – 4 м. Катлаван з поўдня абмяжоўвала супольная з паўзямлянкай № 1 драўляная сценка з укапанымі слупамі невялікіх памераў, з поўдня назіраліся рэшткі двух вялікіх слупоў, якія абмяжоўвалі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. Кулешова

жытло ў квадратах 4, 9. Рэшткі печы-каменкі, размешчаны ў заходняй частцы жытла, маюць наступныя памеры — з поўначы на поўдзень — 1,78 м, з захаду на ўсход — 1,17 м. Рэшткі яшчэ адной(?) печкі фіксаваліся ў межах квадрата 9 (і часткова 8) ва ўсходняй частцы жытла. Магчыма, што гэта рэшткі яшчэ аднаго жытла, контур якога мы не здолелі прасачыць, бо ў межах квадрата 8 (і часткова 9) слой моцна парушаны карэннем дрэва. Рэшткі сцяны катлавана ў выніку гэтага маглі быць дэструктаваны, і таму мы не здолелі іх "злавіць" у працэсе раскопак. Але хутчэй за ўсё ў дадзеным выпадку мы маем справу з падковападобнай, на дзве сцяны, печкай. На гэта ўскосна паказвае і попельная падкавападобная праслойка, якая злучае ў адно цэлае "разарваныя" фрагменты гэтых печак. Такія канструкцыі печы не з'яўляюцца нечым выключным у старажытнасцях трэцяй чвэрці першага тысячагоддзя н.э. Аналагічныя печкі на дзве сцяны былі зафіксаваны пры даследаваннях жытла пянькоўскай культуры ўкраінскімі калегамі[3].

Запаўненне жытла — культурны слой цёмна-шэрага колеру, насычаны вугалем, керамікай V — VII стст.

**Апісанне запаўнення слупавой ямы "А".** Памеры — 0,54 х 0,62 м, глыбіня — 0,14 м. Характар запаўнення — зямля інтэнсіўна чорнага колеру, тлустая, з дамешкамі вугалю (мал. 7:1, 2).

**Апісанне запаўнення слупавой ямы "Б".** Памеры — 0,37 х 0,76 м, глыбіня — 0,19 м. Характар запаўнення: зямля чорнага колеру, насычаная вугалем, пры распрацоўцы ямы ў ёй быў знойдзены фрагмент венца і сценкі гаршка V — VII стст. н.э. Побач з ямай фіксаваліся невялікія каменьчыкі. Магчыма, яны ў свой час выкарыстоўваліся для трамбоўкі, дадатковага замацавання драўляных сценак катлавана паўзямлянкі (мал. 7:1, 2).

[3] Приходнюк О.М. Пеньковская культура. — Воронеж, 1998. — С. 88 (рис. 16:7).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# Раздзел II. РЭЧАВЫ ІНВЕНТАР ГАРАДЗІШЧА

## 2.1. Кераміка

Усе керамічныя вырабы прадстаўлены выключна фрагментамі гаршкоў. Керамічны посуд, знойдзены падчас даследаванняў, падзяляецца на некалькі храналагічных груп: вырабы III – IV стст.; V – VII стст.; другой паловы X – XIII стст.; XVII – XVIII стст.

***Група № 1. Вырабы III – IV стст.***

Нязначная частка керамічнай калекцыі з раскопак гарадзішча прадстаўлена вырабамі, якія маюць прамыя аналагі ў матэрыялах з помніка верхнедняпроўскага варыянта кіеўскай культуры – паселішча Абідня Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці[1]. Гэтая кераміка мае светла-чырвоны альбо жаўтавата-шэры колер, вырабы абпалены няякасна, маюць трохслойны на зломе чарапок (мал. 8; фота 17:1, 2). Таўшчыня чарапкоў – 6–7 мм. У якасці дамешкаў у фармовачнай масе гаршкоў выкарыстаны драсва, ліманіт і шамот. Вонкавая паверхня сценак згладжаная, асобныя гаршкі маюць штрыхоўку на вонкавай паверхні. Знойдзены два маленькія фрагменты сценак гаршка, вонкавая паверхня якіх пакрыта косымі расчэсамі (мал. 8:9, 10; фота 17:2).

**Тып І.** Гаршкі гэтага тыпу маюць элементарныя, адагнутыя вонкі венцы (мал. 8: 1-4). Сярод іх вылучаецца фрагмент венца рабрыстага гаршка і частка тулава гаршка з рабром (дыяметрам па рабры – 14 см) і абламаным венцам (мал. 8:6, 7). Паводле класіфікацыі А. Ільюцік, рабрыстыя гаршкі адносяцца да формы К-3 керамікі Абідні. Для такіх вырабаў уласцівы адагнутае венца і шыйка, выразна вылучаны плячук[2].

---

[1] Ильютик А.В., Поболь Л.Д. Поселение Абидня. Постройки 1, 2, 4, 5 // Верхнее Поднепровье и Подвинье в III – V веках н.э. Раннеславянский мир. – Москва, 2002.– № 4. – С. 54-74; Ильютик А.В., Поболь Л.Д. Керамика Абидни // Памятники эпохи железа и средневековья Беларуси. К 60-летию О.Н. Левко. Материалы по археологии Беларуси. – Мн., 2007. – № 14. – С. 18-36.

[2] Ильютик А.В., Поболь Л.Д. Керамика Абидни // Памятники эпохи железа и средневековья Беларуси. К 60-летию О.Н. Левко. Материалы по археологии Беларуси. – Мн., 2007. – № 14. – С. 21, 36 (рис. 9).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Тып II. Посуд слоікападобнай формы з загнутым усярэдзіну венцам. Вонкавая паверхня вырабу арнаментавана штрыхоўкай. Прадстаўлены адзінкавым фрагментам (мал. 8:5). Паводле класіфікацыі А. Ільюцік, наш выраб належыць да формы CS1 керамікі Абідні (акруглабокія пасудзіны). Для такога посуду характэрны прамыя, з невялікім нахілам усярэдзіну шыйка і венца, выразна вылучаны плячук і акруглае тулава[3].

***Група № 2. Вырабы V – VII стст.***

Найбольш рэпрэзентатыўную частку калекцыі складаюць керамічныя вырабы V–VII стст. Уся кераміка з нашага помніка гэтага часу ляпная, грубая, большасць знаходак мае дрэнна згладжаную, шурпатую паверхню (мал. 9, 10, 11:1–3; фота 15, 18, 19, 20). Арнаментацыя на вырабах адсутнічае. Дамешкі да фармовачнай глінянай масы буйныя, неарганічныя. У якасці асноўнага аташчальніка выкарыстана буйная жарства, у адзінкавых выпадках – шамот.

Посуд мае паверхню карычняватых і цёмна-шэрых таноў. Пераважае посуд цёмна-шэрага колеру. Фрагменты, знойдзеныя ў праслойцы напаленага пяску, памяранцавага колеру па ўсёй таўшчыні чарапка (ад павышанай тэмпературы). Кераміка добра абпаленая, аб чым сведчыць аднаколернасць чарапка на зломе.

Венцы гаршкоў, як правіла, адпавядаюць па таўшчыні сценкам на ўзроўні тулава. Верх большасці венцаў зрэзаны, трапляюцца таксама і экземпляры з акругленым верхам. У калекцыі пераважае посуд з таўшчынёй сценак 0,5–0,8 см. Донныя часткі гаршкоў плоскія, з закрайкамі-"пяткамі" па знешнім абрэзе альбо без іх (мал. 11:3; фота 15). На донцах назіраюцца сляды падсыпак пяску, попелу і жарствы, адбіткі драўляных падставак, на якіх фармаваўся посуд.

Такім чынам, калекцыя керамікі V – VII стст. з гарадзішча Змяёўка па сваіх тэхналагічных характарыстыках ідэнтычная кераміцы з Калочынскага гарадзішча – эталоннага помніка калочынскай культуры[4].

---

[3] Ильютик А.В., Поболь Л.Д. Керамика Абидни // Памятники эпохи железа и средневековья Беларуси. К 60-летию О.Н. Левко. Материалы по археологии Беларуси. – Мн., 2007. – № 14. – С. 20-21, 36 (рис. 9:CS1 № 13).

[4] Макушников О.А. Раннесредневековая керамика городища Колочин I на Гомельщине // Ранние славяне Белорусского Поднепровья и Подвинья. – Мн., 2003. – С. 217-233.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

На Змяёўцы вылучаюцца тры асноўныя тыпы посуду калочынскай культуры.

**Тып I.** Гаршкі цюльпанападобнай формы з шырокай гарлавінай, адагнутай вонкі шыйкай, маюць выразна вылучанае элементарнае венца. Але ў невялікай колькасці сустракаюцца экземпляры, для якіх характэрна нявылучанае венца. Вылучаецца некалькі падварыянтаў гэтага тыпу посуду (мал. 9, 10:1—3, 11:1; фота 18, 19:1—2, 20). Гэты тып керамікі з'яўляецца дамінуючым у магілёўскай калекцыі сярод вырабаў трэцяй чвэрці першага тысячагоддзя н.э.

**Тып II.** Гаршкі S-падобнай формы, з выразнымі плечукамі і адагнутым вонкі элементарным венцам, максімальным пашырэннем на ўзроўні верхняй трэці вышыні (мал. 10:4; фота 19:3). Гэта тыповыя гаршкі пражскага тыпу. Па сваіх тэхналагічных характарыстыках, якасці абпалу нічым прынцыпова не адрозніваюцца ад керамікі папярэдняга тыпу.

**Тып III.** Рабрыстыя гаршкі. Яны маюць максімальнае пашырэнне тулава на ўзроўні сярэдзіны вышыні, якое аформлена ў выглядзе рабрыстага выгіну сценак (рабро ў выглядзе вуглаватага пералому тулава) і нявылучанае венца (мал. 11:2; фота 15). Большасць знаходак рабрыстых гаршкоў (адзінае выключэнне — фрагменты рабрыстых гаршкоў больш ранняга часу, III — IV стст., знойдзеных Я.Р. Рыерам), у адрозненне ад астатняй керамікі гэтага часу з нашай калекцыі, мае надзвычай добра згладжаную паверхню як з вонкавага, так і з унутранага боку.

Адзінкавым фрагментам прадстаўлена сценка гаршка з накольчатым арнаментам у выглядзе ямкавых уцiскаў, якія пакрываюць усю вонкавую паверхню прадмета (мал. 11:8; фота 17:5). Такога тыпу арнаментацыя была характэрна для канца эпохі неаліту — пачатку бронзы (вызначэнне А.У. Коласава). Аднак тэхніка апрацоўкі глiнянай масы, якасць абпалу нічым прынцыповым не адрозніваюцца ад астатняй керамікі трэцяй чвэрці першага тысячагоддзя н.э.

Акрамя гэтага, у межах паўзямлянак былі знойдзены фрагменты глiнянай абмазкі. З вонкавага боку на асобных фрагментах назіраюцца адбіткі пальцаў ад загладжвання (фота 17:3, 4).

***Група № 3. Вырабы другой паловы X — XIII стст.***

Трэцяя група (мал. 11:4—6) — 10 фрагментаў венцаў ад посуду, зробленага на ганчарным крузе (даследаванні 1973 г.). Дыя-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

метры іх розныя — ад 8 да 15 см. Па форме яны падзяляюцца на тры тыпы.

**Тып I.** Кераміка гэтага тыпу мае элементарнае, адагнутае вонкі венца з косазрэзаным краем. Адзін з фрагментаў (мал. 11:4) быў знойдзены ў раскопе № 2, астатнія — на беразе р. Дубравенкі, куды яны былі змытыя пры разбурэнні пляцоўкі гарадзішча.

Адзінкавымі фрагментамі прадстаўлены таксама сценкі кругавых гаршкоў, знойдзеныя пры раскопках 2008 г., якія, улічваючы іх ідэнтычныя тэхналагічныя характарыстыкі з керамікай тыпу № 1, можна таксама прадатаваць другой паловай X — XI стст.

**Тып II.** Кераміка гэтага тыпу прадстаўлена адзінкавым фрагментам. Для прафілёўкі гаршкоў гэтага тыпу характэрна злёгку адагнутае вонкі венца, край якога адцягнуты і падрэзаны, выразная шыйка цыліндрычнай формы. У верхняй частцы плечукоў гэты фрагмент аздоблены хвалістай лініяй (мал. 11:6). Такія вырабы з'явіліся яшчэ ў XIII ст. і бытавалі да канца XVI ст.[5]

**Тып III.** Характарызуецца больш складаным, адагнутым вонкі венцам, край якога падняты ўверх ці злёгку нахілены ўсярэдзіну, утвараючы канаўку для накрыўкі (мал. 11:5). Падобны тып керамікі атрымаў распаўсюджанне ў гарадах Тураўскай зямлі ў канцы XI — XII стст. У Полацкай зямлі, як і ў Верхнім Панямонні, гэтыя гаршкі характэрныя для напластаванняў XII — першай паловы XIII стст. У Галіцкай зямлі дадзеная форма гаршка ў XII — першай палове XIII стст. з'яўлялася вядучай, што дазволіла ў свой час М.В. Малеўскай вызначыць яе як "галіцкі" тып керамікі[6].

***Група № 4. Вырабы XVII — XVIII стст.***

Кераміка гэтага часу знойдзена пры зняцці дзірвану ў верхняй частцы пласта № 1, на глыбіні 3—5 см ад дзённай паверхні. Знаходкі прадстаўлены фрагментамі венцаў, сценак мораных гаршкоў і ручкай збанка (мал. 11:7). Колькасць знаходак гэтага часу мінімальная (гл. калекцыйныя вопісы).

---

[5] Мяцельскі А.А. Старадаўні Крычаў. Гістарычна-археалагічны нарыс горада ад старажытных часоў да канца XVIII ст. — Мн., 2003. — С. 65-66. Мал. 51. Аддзел I. Тып II. Варыянт Б.

[6] Малевская М.В. К вопросу о керамике Галицкой земли XII — XIII вв. // КСИА. Средневековая археология. — Москва, 1969. — № 120. — С. 8.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## 2.2. Металічныя вырабы

Металічныя вырабы складаюць нязначную колькасць знаходак у калекцыі.

Вырабы з *чорных металаў* XVII – XVIII стст. прадстаўлены знаходкамі паясной спражкі ў дзірване гарадзішча, абутковай пляскатай падкоўкай XVII ст. і цвічком (мал. 13:3, 4; фота 16:6, 7).

Найбольш каштоўная знаходка з чорных металаў – камбінаваная прылада працы – крэсіва-шыла (мал. 13:1; фота 16:4), знойдзеная ў праслойцы вугалю разам з керамічным матэрыялам V – VII стст. Аналагічнае па форме крэсіва было знойдзена Л.Д. Пабалем пры раскопках могільніка верхнедняпроўскага варыянта кіеўскай культуры (пахаванне № 2) у в. Тайманава Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Па суправаджальным матэрыяле яно датуецца канцом IV – V стст[7]. Такія крэсівы характэрныя таксама і для тушамлінскіх старажытнасцей трэцяй чвэрці першага тысячагоддзя н.э.[8] Больш за 50 асобнікаў такіх крэсіваў знойдзена пры раскопках гарадзішча Нікадзімава Горацкага раёна Магілёўскай вобласці А.А. Седзіным[9].

***Нож.*** Выраблены з жалеза. Знойдзены ў верхнім, цёмна-шэрым пласце раскопа № 1. Мае прамую, патоўшчаную спінку, асіметрычныя ўступы (частка тронка абламаная) (мал. 13:2; фота 16:5). Такія рэчы мелі шырокае распаўсюджанне ўжо ў старажытнасцях кіеўскай культуры, а таксама шматлікія аналагі і ў раннесярэднявечных старажытнасцях Усходняй Еўропы[10]. Наш асобнік можна стратыграфічна датаваць V – VII стст. н.э.

Вырабы з ***каляровых металаў*** прадстаўлены бронзавымі і сярэбранымі рэчамі.

Найбольш цікавымі знаходкамі з'яўляюцца чатыры ***бронзавыя бранзалеты*** з патоўшчанымі канцамі і геаметрычным арна-

---

[7] Поболь Л.Д., Дубицкая Н.Н., Пилипцевич В.В. Могильник у д. Тайманово // Ранние славяне Белорусского Поднепровья и Подвинья. Материалы по археологии Беларуси. – Мн., 2003. – № 8. – С. 30, 58 (рис. 14:12).

[8] Шмидт Е.А. Вооружение и снаряжение воинов-всадников Тушемлинских племен Поднепровья // ГАЗ. – 1995. – № 6. – С. 113 (рис. I: 12).

[9] І.А. Марзалюк выказвае падзяку шаноўнаму калегу А.А. Седзіну за магчымасць азнаёміцца з матэрыяламі яго раскопак.

[10] Терпиловский Р.В. Ранние славяне Подесенья III – V вв. – Киев, 1984. – С. 26.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ментам V – VII стст. (мал. 12:1, 2, 4, 5; фота 16:1–2). Два такіх вырабы, як адзначалася, былі знойдзены Я.Р. Рыерам пры выратавальных раскопках на гэтым гарадзішчы ў 1973 г., а яшчэ два – пры раскопках І.А. Марзалюка ў 2008 г. Гэта былі скарбы-"паклады", аб чым сведчыць тое, што абедзве пары былі сашчэпленыя канцамі паміж сабой.

Бранзалеты масіўныя, акруглыя ў сячэнні, маюць авальную ў плане форму, патоўшчаныя канцы. Бліжэй да тарцоў на ўсе вырабы нанесены ў тэхніцы глыбокай гравіроўкі арнамент, які аздабляе ўнутраную і знешнюю паверхню. Ён складаецца з двух паясоў кальцавых ліній, прастора паміж якіх запоўнена глыбокай насечкай у выглядзе "елачкі" – косых перакрыжаваных ліній.

Найбольш раннія знаходкі бранзалетаў з патоўшчанымі канцамі такога тыпу сустракаюцца ў сармацкіх комплексах II – III стст.[11] Такія ж вырабы былі характэрныя і для старажытнасцей кіеўскай культуры Падзясення III – V стст., а таксама і для прыбалтыйскіх могільнікаў, дзе яны датуюцца другой паловай IV – першай паловай V ст.[12]

На тэрыторыі Магілёўскага Падняпроўя гэты від вырабаў працягваў бытаваць і ў V – VII стст. н.э. Акрамя чатырох такіх бранзалетаў, знойдзеных аўтарамі манаграфіі пры даследаванні гарадзішча Змяёўка ў Магілёве, шэсць аналагічных артэфактаў былі зафіксаваны пры раскопках гарадзішча Нікадзімава Горацкага раёна Магілёўскай вобласці А.А. Седзіным[13]. *Верхняя храналагічная мяжа* бытавання бранзалетаў гэтага тыпу ў Нікадзімава, дзякуючы шматлікім знаходкам фібул анцкага выгляду, датуецца часам не пазней трэцяй чвэрці VII ст.[14] Аналагічныя бранзалеты былі знойдзены таксама і ў шэрагу помнікаў Усходняй Еўропы V – VII стст., у першую чаргу ў старажытнасцях пянькоўскай і калочынскай культур[15]. Характэрныя яны таксама і для старажытнас-

---

[11] Тамсама. – С. 30.
[12] Тамсама.
[13] Родинкова В.Е., Седин А.А. Браслеты Никодимовского городища // Восточная Европа в средневековье. К 80-летию В.В. Седова. – Москва, 2004. – С. 240-241 (рис. 4).
[14] Тамсама. – С. 245.
[15] Горюнов Е.А. Ранние этапы истории славян Днепровского Левобережья. – Ленинград, 1981. – С. 40, 43 (рис. 12: 8,9; 14: 5,7, 10); Приходнюк О.М. Пеньковская культура. – Воронеж, 1998. – С. 136, 140 (рис. 66:7; 71:4).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цей пражска-карчакскай культуры. Такія рэчы бытавалі на пражска-карчакскіх помніках паводле матэрыялаў аднаго з аўтарытэтнейшых украінскіх знаўцаў гэтай раннеславянскай культуры, В.Д. Барана, у канцы VI — першай палове VII ст.[16]

Пры раскопках Я.Р. Рыера ў 1973 г. быў знойдзены кавалак шлаку — след бронзаліцейнай вытворчасці на гарадзішчы, што дазваляе выказаць меркаванне аб магчымай мясцовай вытворчасці нашых бранзалетаў[17].

Відаць, што гэтым жа часам (V — VII стст.) трэба датаваць знаходку бронзавага *рыбалоўнага кручка* (мал. 12:3; фота 16:3), які быў зафіксаваны пры зняцці дзірвану ў верхняй частцы пласта № 1. Найбольш позняя знаходка з каляровых металаў — адзначаная вышэй сярэбраная манета — "лускавінка" маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча (фота 16:8).

[16] Баран В.Д., Максимов Е.В., Магомедов Б.В. и др. Славяне Юго-Восточной Европы в предгосударственный период. — Киев, 1990. — С. 248, 250 (рис. 51: 15,17); Боран В.Д. Слов'яни у другій половини І тис. н. э. // Етнічна та етнокультурна історія України. Т. 1. — Київ, 2005. — С. 236 (рис. 9).

[17] Архіў Інстытута гісторыі НАНБ. — № 429: Риер Я.Г. Отчет об археологических работах в Могилевской области в 1973 г. — Могилев, 1974. — С. 27.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Праведзеныя археалагічныя даследаванні на гарадзішчы Змяёўка (Пелагееўскае гарадзішча) дазваляюць зрабіць наступныя высновы:

1. Атрыманыя матэрыялы сведчаць, што гарадзішча Змяёўка – трохслойны помнік.

2. Найбольш старажытныя знаходкі прадстаўлены керамічным матэрыялам верхнедняпроўскага варыянта кіеўскай культуры. Колькасць знаходак гэтага часу невялікая. Культурны пласт згаданай эпохі ў даследававанай частцы гарадзішча не захаваўся. Адносіць да больш ранняй керамікі адзінкавы фрагмент, аздоблены накольчатым арнаментам, нам здаецца сумніўным, бо па тэхніцы апрацоўкі керамічнай масы ён нічым не адрозніваецца ад астатніх вырабаў трэцяй чвэрці першага тысячагоддзя н.э.

3. Росквіт жыцця на гарадзішчы звязаны са знаходжаннем тут умацаванага паселішча калочынскай культуры. Аб гэтым пераканаўча сведчаць керамічны матэрыял, тыповы для калочынскіх старажытнасцей, характар домабудаўніцтва (каркасна-слупавыя паўзямлянкі з печамі-каменкамі).

4. Попельны пласт, які назіраецца на мацерыку амаль па ўсёй пляцоўцы (як відаць з профіля $AA_1$), а таксама інтэнсіўныя попельныя пласты і праслойкі ў рэштках жытла з'яўляюцца, верагодна, слядамі пажару на гарадзішчы, які здарыўся дзесьці ў трэцяй чвэрці першага тысячагоддзя н.э. Такім чынам, гарадзішча зведала штурм і было знішчана. Як нам здаецца, ёсць сэнс звязваць гэтую падзею з адной з карных расправаў авараў над антамі, магчыма, і са знакамітым паходам 602 года, пра які згадваў сучаснік тых падзей Феафілакт Сімаката: *"...хаган, які даведаўся аб рамейскім нападзе, выправіў Апсіха з войскамі, каб знішчыць племя антаў, якое было хаўруснікам рамеяў"*[1]. У свой час В.В. Сядоў увогуле катэгарычна адмаўляў, насуперак адназнач-

[1] Свод древнейших письменных известий о славянах. – М., 1995. – Т. II. – С. 153.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ным сведчанням пісьмовых крыніц, магчымасць паходу авараў супраць антаў, якіх ён атаясамліваў толькі з пянькоўскай культурай, бо селішчы гэтай культуры не ўтрымліваюць археалагічных сведчанняў аб іх спаленні, а асобныя паселішчы пянькоўскай культуры дажываюць да VIII ст. н.э.[2] Але справа ў тым, што калі гаварыць аб пянькоўскай культуры, то і там толькі помнікі, размешчаныя на Паўднёвым Бугу і ў Малдавіі, маюць выхад да старажытнасцей VIII — IX стст.[3] Аднак лічыць гэтае палажэнне даказаным цалкам для абшару ўсёй культуры таксама нельга. Паводле ўкраінскіх археолагаў, старажытнасці пянькоўскай культуры ў цэлым не выходзяць за межы VII ст.[4] Менавіта ў трэцяй чвэрці VII ст. н.э. у Сярэднім Падняпроўі выпалі скарбы першай групы анцкага аблічча[5]. Калі пагадзіцца з добра аргументаванай тэзай, што калочынскія старажытнасці, якія таксама, як і пянькоўскія, генетычна звязаны са сваімі папярэднікамі — старажытнасцямі кіеўскай культуры — і практычна аналагічныя па ўсіх базавых характарыстыках[6], то сітуацыя будзе выглядаць інакш. Калочынскія старажытнасці Беларусі і сумежных з імі помнікаў Украіны гінуць у агні пажараў якраз у VII ст. Дарэчы, і найбольш карэктнае датаванне рэчавага матэрыялу, і датаванне па радыевугляроду дазваляюць зрабіць вывад, што існаванне калочынскай культуры практычна не выходзіць за храналагічныя межы VII ст. Больш таго, радыевугляроднае датаванне для знішчаных калочынскіх помнікаў (напрыклад, дата знішчэння калочынскага паселішча Смальянь), дазваляе гаварыць, што гэтая падзея адбылася напрыканцы VI — пачатку VII ст. н.э. Знойдзеныя на гэтым помніку аварскія трохлопасцевыя наканечнікі стрэл найбольшых памераў

---

[2] Седов В.В. Восточные славяне в VI — XIII вв. — Москва, 1982. — С. 28.

[3] Горюнов Е.А. Ранние этапы истории славян Днепровского Левобережья. — Ленинград, 1981. — С. 85.

[4] Славяне Юго-Восточной Европы в предгосударственный период / В.Д. Баран [и др.]. — Киев, 1990. — С. 353; Приходнюк О.М. Пеньковская культура. — Воронеж, 1998. С. 47; Pierwotne siedziby Słowian. — Kraków, 2000. — S. 220-231, 291-308, 358, 359.

[5] Гавритухин И.О., Обламский А.М. Гапоновский клад и его культурно-исторический контекст. — Москва, 1996. — С. 95.

[6] Горюнов Е.А. Ранние этапы истории славян Днепровского Левобережья. — Ленинград, 1981. — С. 59-60; Терпиловский Р.В. Ранние славяне Подесенья III — V вв. — Киев. 1984. — С. 83, 85.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з упорам на шыйцы датуюцца другой паловай VI — VII стст. н.э.[7] Прыкладна ў гэты ж час гіне ў агні пажару знакамітае Нікадзімаўскае гарадзішча — эталонны помнік банцараўска-тушамлінскай культуры. Даследчыкам гэтага помніка, А.А. Седзіным, была зафіксавана вялікая колькасць класічных для аварскіх старажытнасцей трохлопасцевых наканечнікаў стрэл, якія ў папярочным сячэнні маюць выгляд трохпраменнай зоркі[8]. Такія ж самыя наканечнікі стрэл былі зафіксаваны гэтым даследчыкам пры вывучэнні пахаванняў жыхароў гарадзішча Нікадзімава, размешчаных у мысавай частцы гэтага помніка. У астанках памерлых, кальцынiраваных костках таксама былі знойдзены аварскія стрэлы. Даследчык піша: "*Для гэтага ўчастка характэрна вялікая колькасць наканечнікаў стрэл, якія былі знойдзены разам з кальцыніраванымі косткамі на значнай глыбіні, у адрозненне ад наканечнікаў, атрыманых з верхніх пластоў у другіх месцах гарадзішча. Гэтае назіранне дазваляе зрабіць выснову аб тым, што наканечнікі стрэл трапілі ў культурны слой з крэміраваных цел забітых людзей. Верагодна, жыхары гарадзішча неаднаразова мелі вайсковыя сутыкненні з тымі, хто пакінуў такія наканечнікі стрэл у верхнім культурным гарызонце, які ўтрымлівае сляды пажару і знішчэння гарадзішча*"[9]. Дарэчы, атрыманыя даты для Нікадзімава па радыевугляроду таксама ўкладваюцца ў дадзеныя храналагічныя межы. Найбольш позняя з атрыманых чатырох радыевугляродных дат для помніка дазваляе гаварыць аб знішчэнні гарадзішча не пазней трэцяй чвэрці VII ст. н.э.[10] Відаць, у той самы час было знішчана і гарадзішча Стары Шклоў. Рэшткі спаленых умацаванняў гэтага помніка з ляпной керамікай V — VII стст. н.э. фіксаваліся пры прарэзцы вала, а таксама на краі пляцоўкі помніка, дзе мы прасачылі два рады згарэлых слупоў, пры выбарцы якіх была знойдзена тыповая для V — VII стст. шпора і ляпная кераміка[11]. VII стагод-

[7] Баран В.Д., Максимов Е.В., Магомедов Б.В. и др. Славяне Юго-Восточной Европы в предгосударственный период. — Киев, 1990. — С. 253.

[8] Седин А.А. Оружие из городища Никодимово // V абласныя Магілёўскія краязнаўчыя чытанні (28 кастрычніка 1993 г.). — Магілёў, 1994. — С. 14-15; Медведев А.Ф. Ручное метательное оружие (лук и стрелы, самострел) — VIII — XIV вв. // Свод археологических источников. —Москва, Ленинград, 1966. — Вып. Е 1—36. — С. 58-59.

[9] Седин А.А. Новые материалы из городища третей четверти I тыс. н.э. Никодимово // Магілёўшчына. IX выпуск. — Магілёў, 2007. — С. 93.

[10] Седин А.А. Городище Никодимово (Нікадзімава) // Slavia Antiqua. Tom. XXVI. — Poznac, 1995. — S. 160.

[11] Марзалюк І.А. Справаздача аб археалагічных раскопках на гарадзішчы "Стары Шклоў" Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці ў 2008 г. — 168 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

дзем датуецца і знішчэнне гарадзішч каля в. Кісялі (Дымакуры) Талачынскага раёна і в. Чаркасава Аршанскага раёна Віцебскай вобласці[12]. Знішчэнне помнікаў пянькоўскай і калочынскай культур такія даследчыкі, як Гаўрытухін і Абламскі звязваюць не з непасрэднымі паходамі авараў на анцкія землі, а з "хатняй вайной" старажытных славян паміж сабой. Паводле гэтых аўтараў, носьбіты кола пражскіх старажытнасцей вынішчылі насельніцтва пяньkoўскай, калочынскай і тушамлінска-банцараўскай культур. Безумоўна, шэраг прыведзеных аргументаў шаноўных аўтараў дазваляе пагадзіцца з іх тэзісам, што падчас згаданай вайны склавены (насельніцтва пражскай культуры) бралі ўдзел у гэтых сутычках. Але хіба адно пярэчыць другому? Хіба склавены не захоўвалі сваю вернасць на той час аварам, хіба перасталі быць залежнымі ад апошніх? Улічваючы вялікую колькасць тыповых качэўніцкіх, аварскіх стрэл на знішчаных помніках трэцяй чвэрці першага тысячагоддзя н.э. на тэрыторыі Украіны і Беларусі, лагічна меркаваць, што склавены прыйшлі на землі сваіх суседзяў разам з аварамі, для якіх яны былі выдатнымі праваднікамі, якія добра ведалі мясцовасць. На нашу думку, у цэлым нельга гаварыць аб кантынуітэце паміж старажытнасцямі калочынскай і банцараўска-тушамлінскай культуры з больш позмнімі, бясспрэчна славянскімі, старажытнасцямі VIII – IX стст., таму што пасля таго пагрому VII ст. насельніцтва гэтых культур страчвае ўласную самабытнасць, перастае існаваць як адметная сацыякультурная супольнасць.

5. Кругавая кераміка X – XII стст. сведчыць аб існаванні насельніцтва на нашым гарадзішчы і ў раннім сярэднявеччы. Верагодна, што гісторыя Змяёўкі ў гэтыя часы была цесна звязана з найстаражытнейшай гісторыяй горада Магілёва. Нельга таксама выключыць магчымасць таго, што населенае месца на Змяёўцы магло папярэднічаць паселішчу ў вусці р. Дубравенкі, з якога пачаўся летапісны Магілёў. Бо, як вядома з гісторыі рассялення на ўсёй тэрыторыі Еўропы, жыхары часцей выбіралі месцы ў невялікай адлегласці ад буйных рэк па прычыне большай бяспекі. Узгадаем, што менавіта па Дняпры напрыканцы першага тысячагоддзя н.э. праходзіў вядомы гандлёвы шлях "з варяг у грэкі".

[12] Левко О.Н., Колосовский Ю. В. Раскопки городищ у д. Кисели (Дымокуры) Толочинского района и у д. Черкасово Оршанского района Витебской области // Ранние славяне Белорусского Поднепровья и Подвинья. – Мн., 2003. – С. 183, 187.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# КАЛЕКЦЫЙНЫ ВОПІС ЗНАХОДАК 1973 г.

| № п/п | № Р. кв. | Назва артэфактаў | Колькасць | Глыбіня, м | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Р.1. кв.Б1 | Нож | 1 | 0,5 | V – VII стст. |
| 2 | Р.1. кв.Б1 – Б2 | Бранзалеты | 1 | 0,7 | Бронзавыя, з патоўшчанымі канцамі і геаметрычным арнаментам. V – VII стст. |
| 3-4 | Р.1. Б1 | Фрагменты керамікі | 2 | 0,5 | |
| 5 | Р.1. кв.Г2 | Фрагмент керамікі | 1 | 0,5 | |
| 6-7 | Р.1. кв.Г2 | Фрагменты керамікі | 2 | 0,6 | |
| 8-10 | Р.1. кв.В1 | Фрагменты керамікі | 3 | 0,5 – 0,7 | V – VII стст. |
| 11–13 | Р.1. кв.В2 | Фрагменты керамікі | 3 | 0,5 – 0,7 | V – VII стст. |
| 14-15 | Р.1. кв.В3 | Фрагменты керамікі | 2 | 0,3 – 0,5 | V – VII стст. |
| 16-21 | Р.1. кв.В4 | Фрагменты керамікі | 6 | 0,2 – 0,4 | |
| 22-27 | Р.1. кв.Б1 | Фрагменты керамікі | 6 | 0,6 – 0,9 | |
| 28 | Р.1. кв.Б2 | Фрагменты керамікі | 1 | 0,8 | |
| 29 | Р.1. кв.Б3 | Фрагменты керамікі | 1 | 0,9 | |
| 30-34 | Р.1. кв.В1 | Фрагменты керамікі | 4 | 1 | |
| 35-37 | Р.1. кв.Б1 | Фрагменты керамікі | 3 | 0,8-0,9 | |
| 38 | Р.1. кв.Б1 | Фрагменты керамікі | 1 | 0,9 | |
| 39 | Р.1. кв.Б4 | Фрагменты керамікі | 1 | 0,7 | |
| 40-41 | Р.1. кв.А2 | Фрагменты керамікі | 2 | 1,2 | |
| 42-46 | Р.1. кв.В2 | Фрагменты керамікі | 5 | 1,1-1,3 | |
| 47-48 | Р.1. кв.В3 | Фрагменты керамікі | 2 | 1,1-1,3 | |
| 49-50 | Р.1. кв.В4 | Фрагменты керамікі | 2 | 0,9 | |
| 51-52 | Р.1. кв.Б2 | Фрагменты керамікі | | 1,2-1,3 | |
| 53-55 | Р.1. кв.Б3 | Фрагменты керамікі | 3 | 0,9-1 | |
| 56-57 | Р.1. кв.Б4 | Фрагменты керамікі | 2 | 0,9 | |
| 58-70 | Р.2 | Фрагменты керамікі | 13 | 0,1-0,3 | |
| 71-79 | На беразе р. Дубравенкі | Фрагменты керамікі | 9 | Пад'ёмны матэрыял | |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# КАЛЕКЦЫЙНЫ ВОПІС ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ЗНАХОДАК 2008 г.

| № п/п | № Р. кв. | Назва артэфактаў | Колькасць | Пласт | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Р.3. кв.1 | Рыбалоўны кручок | 1 | Дзірван | Бронзавы, без "бародкі" |
| 2 | Р.3. кв.1 | Спражка | 1 | Дзірван | Жалеза, моцна каразіраванае |
| 3-4 | Тр.1. кв.3 | Бранзалеты | 2 | 5 | Бронзавыя, з патоўшчанымі канцамі і геаметрычным арнаментам. V – VII стст. |
| 5 | Р.3. кв.10 | Шыла-крэсіва | 1 | 2 | V – VII ст. |
| 6 | Р.3. кв.1. | "Лускавінка" | 1 | 1 | Аляксей Міхайлавіч. XVII ст. |
| 7–30 | Р.3. кв.1 | Зерне | 20 | 6 | V – VII стст. |
| 31–32 | Р.3. кв.4 | Зерне | 2 | 6 | V – VII стст. |
| 33 | Р.3. кв.7 | Зерне | 1 | 6 | V – VII стст. |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# КАЛЕКЦЫЙНЫ ВОПІС ЗНАХОДАК. РАСКОП 3. 2008 г.

| № п/п | № кв. | Назва артэфактаў | Колькасць | Пласт | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| 1-2 | Дзірван | Абмазка | 2 | 1 | Субструкцыя ўмацаванняў краю вала |
| 3-4 | Дзірван | Сценкі гаршкоў | 2 | 1 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 5 | Дзірван | Сценка гаршка | 1 | 1 | Светла-жоўтага колеру. III – IV стст. |
| 6 | Дзірван | Гільза | 1 | 1 | Ад дробнакаліберной вінтоўкі |
| 7-8 | 1 | Фрагмент глінянай абмазкі | 2 | 1 | Чырвоны, з адбіткамі пальцаў на згладжанай паверхні. V – VII стст. |
| 9-10 | 1 | Сценкі гаршкоў | 2 | 1 | Шэрыя. V – VII стст. |
| 11-12 | 1 | Сценкі гаршкоў | 2 | 1 | Шэрыя, са слядамі нагару на сценцы. V – VII стст. |
| 13-19 | 1 | Сценкі гаршкоў | 7 | 6 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 20 | 3 | Цвік-вухналь | 1 | 1 | XVII ст. |
| 21 | 3 | Ручка збанка | 1 | 1 | Шэрая, дымлёная. XVII ст. |
| 22-23 | 3 | Сценкі гаршкоў | 2 | 1 | III – IV стст. |
| 24-26 | 3 | Зубы | 3 | 6 | Хатніх жывёл |
| 27-45 | 3 | Сценкі гаршкоў | 19 | 6 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 46-49 | 3 | Сценкі гаршкоў | 4 | 6 | Са светлай гліны. III – IV стст. |
| 50-51 | 3 | Донцы гаршкоў | 2 | 6 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 52-55 | 3 | Венцы гаршкоў | 4 | 6 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 56 | 3 | Венца гаршка | 1 | 6 | Светла-чырвоны, са штрыхом з унутранага боку. III – IV стст. |
| 57-58 | 4 | Сценкі гаршкоў | 2 | 6 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 59 | 5 | Венца талеркі | 1 | 1 | З чырвонай гліны, з зялёна-карычневай палівай са знешняга боку. XVII ст. |
| 60 | 5 | Гільзы | 1 | 1 | Ад дробнакаліберной вінтоўкі |
| 61 | 5 | Цвік | 1 | 1 | Савецкага часу |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| № п/п | № кв. | Назва артэфактаў | Колькасць | Пласт | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| 62 | 5 | Фрагмент венца | 1 | 1 | Мораная кераміка. Канец XVI – першая палова XVII ст. |
| 63-69 | 5 | Сценкі гаршкоў | 7 | 1 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 70-76 | 7 | Вугаль | 7 | 1 | |
| 77 | 7 | Косткі | 7 | 1 | Хатніх жывёл |
| 78 | 7 | Сценка гаршка | 1 | 6 | Другая палова X – XI стст. |
| 79-82 | 7 | Вугаль | 4 | 6 | |
| 83-84 | 7 | Венцы гаршкоў | 2 | 6 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 85-87 | 7 | Донцы гаршкоў | 3 | 6 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 88-113 | 7 | Сценкі гаршкоў | 26 | 6 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 114-115 | 9 | Сценкі гаршкоў | 2 | 2 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 116 | 9 | Сценка гаршка | 1 | 2 | Светлага колеру, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 117-119 | 10 | Венцы гаршкоў | 3 | 3 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 120-124 | 10 | Сценкі гаршкоў | 5 | 3 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 125 | 10 | Сценка гаршка | 1 | 3 | Светла-чырвоная, абпал не зусім якасны. III – IV стст. |
| 126 | 10 | Венца гаршка | 1 | 2 | Шэрага колеру, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# КАЛЕКЦЫЙНЫ ВОПІС ЗНАХОДАК. ТРАНШЭЯ 1

| № п/п | № кв. | Назва артэфактаў | Колькасць | Пласт | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| 1-6 | 1 | Сценкі гаршкоў | 7 | 1 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 7-8 | 3 | Сценкі гаршкоў | 2 | 1 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 9-10 | 3 | Сценкі гаршкоў | 2 | 1 | Дымлёныя. XVII ст. |
| 11 | 1 | Сценка гаршка | 1 | 1 | Светла-чырвоная. V – VII стст. |
| 12 | 3 | Сценка гаршка | 1 | 1 | Падпраўленая на крузе. X – XI стст. |
| 13-19 | 3 | Сценкі гаршкоў | 7 | 2 | Шэрыя, з шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 20-21 | 3 | Венцы гаршкоў | 2 | 2 | З шурпатай паверхняй. V – VII стст. |
| 22 | 4 | Костка | 1 | 1 | Хатняй жывёлы |
| 23-24 | 4 | Косткі | 2 | 1 | Хатніх жывёл |
| 25 | 4 | Гліняная абмазка | 1 | 1 | Субструкцыя ўмацаваннняў краю вала |
| 26 | 4 | Гліняная абмазка | 1 | 1 | Субструкцыя ўмацаваннняў краю вала |
| 27 | 4 | Гліняная абмазка | 1 | 1 | Субструкцыя ўмацаваннняў краю вала |
| 28 | 4 | Донца гаршка | 1 | 1 | Шэрае, з шурпатай паверхняй, выразнай "пяткай". V – VII стст. |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СПІС МАЛЮНКАЎ І ФОТАЗДЫМКАЎ

**Мал. 1.** Сітуацыйны план даследаванняў.

**Мал. 2.** Зачыстка рэшткаў пляцоўкі і вала гарадзішча Змяёўка з паўднёвага боку. Разгорткі профіляў раскопу №1.

**Мал. 3.** Разгорткі профіляў, планы знаходак і нівеліровачныя планы раскопаў №1 і №2.

**Мал. 4.** Траншэя №1. Разгортка профіляў.

**Мал. 5.** Траншэя №1: 1 — план пласта №5, 2 — план пласта №8, 3 — план мацерыка.

**Мал. 6.** Раскоп №3. Разгортка профіляў.

**Мал. 7.** 1 — раскоп №3. План мацерыка, 2 — разрэз жытла, ям, планы апечкаў печаў.

**Мал. 8.** Кераміка кіеўскай культуры III — V стст. н.э.

**Мал. 9.** Кераміка калочынскай культуры V — VII стст. н.э.

**Мал. 10.** Кераміка калочынскай культуры V — VII стст. н.э.

**Мал. 11.** 1–3, 8 — кераміка калочынскай культуры V — VII стст. н.э.; 4–6 — усходнеславянская кераміка, канец X — XIII стст.; 7 — ручка збанка XVII ст.

**Мал. 12.** 1, 2, 4, 5 — бранзалеты (бронза), 3 — кручок. Калочынская культура V — VII стст.

**Мал. 13.** Вырабы з чорных металаў: 1 — крэсіва-шыла V — VII стст., 2 — нож V — VII стст., 3 — абутковая падкоўка XVII ст., 4 — спражка ад пояса XVII ст.

**Фота 1.** Гарадзішча ў пачатку XX ст.

**Фота 2.** Гарадзішча ў 50-я гг. XX ст.

**Фота 3.** Гарадзішча. Агульны выгляд з усходу (1973).

**Фота 4.** Гарадзішча. Агульны выгляд з паўночнага ўсходу (1973).

**Фота 5.** Профіль $AA_1$. Зачыстка рэшткаў пляцоўкі і вала гарадзішча. Выгляд з поўначы (1973).

**Фота 6.** PN№1. Зачыстка мацерыка. Выгляд з поўначы (1973).

**Фота 7.** Траншэя №1. Змяёўка. Паўночны профіль, квадрат № 1, 2. Выгляд з паўднёвага ўсходу.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Фота 8.** Траншэя №1. Змяёўка. Агульны выгляд з захаду. У межах квадрата №4 чытаецца запаўненне паўзямлянкі.

**Фота 9.** Траншэя №1. Змяёўка. Выгляд з паўднёвага захаду. Квадрат №4, часткова №3.

**Фота 10.** Раскоп №3. Змяёўка. Выгляд з паўночнага захаду. Рабочы момант расчысткі апечка печы-каменкі ў паўзямлянцы №1.

**Фота 11.** Раскоп №3. Змяёўка. Выгляд з захаду. Расчыстка паўзямлянкі №1.

**Фота 12.** Раскоп №3. Змяёўка. Выгляд з паўночнага ўсходу. Рабочы момант расчысткі паўзямлянкі №2. Рэшткі апечка печы.

**Фота 13.** Раскоп №3. Змяёўка. Выгляд з усходу. Рэшткі апечка печы-каменкі паўзямлянкі №2.

**Фота 14.** Раскоп №3. Змяёўка. Выгляд зверху. Рэшткі апечка печы-каменкі паўзямлянкі №2.

**Фота 15.** Рабрысты гаршчок. Калочынская культура V — VII стст. н.э.

**Фота 16.** 1—2 — бранзалеты (бронза) V — VII стст., 3 — кручок (бронза) V — VII стст., 4 — крэсіва-шыла V — VII стст., 5 — нож V — VII стст., 6 — абутковая падкоўка XVII ст., 7 — спражка ад пояса XVII ст., 8 — "лускавінка", сярэдзіна XVII ст.

**Фота 17.** 1-2 — кераміка кіеўскай культуры, 3 — фрагмент гліня-най абмазкі з катлавана паўзямлянкі V — VII стст., 4 — фрагмент абваленага даху паўзямлянкі V — VII стст., 5 — фрагмент сценкі гаршка V — VII стст.(?)

**Фота 18.** Кераміка калочынскай культуры V — VII стст. н.э.

**Фота 19.** Кераміка калочынскай культуры V — VII стст. н.э.

**Фота 20.** Кераміка калочынскай культуры V — VII стст. н.э.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СПІС КРЫНІЦ І ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Архіў Інстытута гісторыі НАНБ. – № 429: Риер Я.Г. Отчет об археологических работах в Могилевской области в 1973 г. – Могилев, 1974. – 28 с.
2. Архіў Інстытута гісторыі НАНБ. – № 429: Риер Я.Г. Отчет об археологических работах в Могилевской области в 1973 г. – Могилев, 1974. – 27 с.
3. Архіў Інстытута гісторыі НАНБ. – № 2593: Марзалюк І.А. Справаздача аб археалагічных раскопках Пелагееўскага гарадзішча (Змяёўка) у г. Магілёве ў 2008 г. – Магілёў, 2009. – 28 с.
4. Архіў Інстытута гісторыі НАНБ. – № 2595: Марзалюк І.А. Справаздача аб археалагічных раскопках на гарадзішчы Стары Шклоў Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці ў 2008 г.
5. Славяне Юго-Восточной Европы в предгосударственный период / В.Д. Баран [и др.]. – Киев, 1990.
6. **Боран, В.Д.** Слов'яни у другій половини І тис. н.э. / В.Д. Боран // Етнічна та етнокультурна історія України. Т. 1. – Київ, 2005. – С. 236.
7. **Гавритухин, И.О.** Гапоновский клад и его культурно-исторический контекст / И.О. Гавритухин, А.М. Обламский. – Москва, 1996.
8. **Горюнов, Е.А.** Ранние этапы истории славян Днепровского Левобережья / Е.А. Горюнов. – Ленинград, 1981.
9. **Дубицкая, Н.Н.** Могильник у д. Тайманово / Н.Н. Дубицкая, В.В. Пилипцевич, Л.Д. Поболь // Ранние славяне Белорусского Поднепровья и Подвинья: мат-лы по археологии Беларуси. – 2003. – № 8. – С. 30-58.
10. **Ильютик, А.В.** Керамика Абидни/ А.В. Ильютик, Л.Д. Поболь // Памятники эпохи железа и средневековья Беларуси. К 60-летию О.Н. Левко: мат-лы по археологии Беларуси. – Мн., 2007. – № 14. – С. 18-36.
11. **Ильютик, А.В.** Поселение Абидня. Постройки 1, 2, 4, 5 / А.В. Ильютик, Л.Д. Поболь // Верхнее Поднепровье и Подвинье в III – V веках н.э. Раннеславянский мир. – Москва, 2002. – № 4. – С. 54-74.
12. **Копытин, В.Ф.** Археологические памятники Могилева и окрестностей/ В.Ф. Копытин. – Могилев, 1993.
13. **Левко, О.Н.** Раскопки городищ у д. Кисели (Дымокуры) Толочинского района и у д. Черкасово Оршанского района Витебской области / О.Н. Левко, Ю.В. Колосовский // Ранние славяне Белорусского Поднепровья и Подвинья. – Мн., 2003. – С. 183-187.
14. **Макушников, О.А.** Раннесредневековая керамика городища Колочин I на Гомельщине / О.А. Макушников // Ранние славяне Белорусского Поднепровья и Подвинья. – Мн., 2003. – С. 217-233.
15. **Малевская, М.В.** К вопросу о керамике Галицкой земли XII – XIII вв. / М.В. Малевская // КСИА. Средневековая археология. – 1969. – №120. – С. 8.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

16. **Медведев, А.Ф.** Ручное метательное оружие (лук и стрелы, самострел) – VIII – XIV вв. / А.Ф. Медведев // Свод археологических источников. – Москва, Ленинград, 1966. – Вып. Е 1–36. – С. 58-59.
17. **Мяцельскі, А.А.** Старадаўні Крычаў. Гістарычна-археалагічны нарыс горада ад старажытных часоў да канца XVIII ст. / А.А. Мяцельскі. – Мн., 2003
18. **Приходнюк, О.М.** Пеньковская культура / О.М. Приходнюк. – Воронеж, 1998.
19. **Родинкова В.Е.** Браслеты Никодимовского городища / В.Е. Родинкова, А.А. Седин // Восточная Европа в средневековье. К 80-летию В.В. Седова. – Москва, 2004. – С. 240-245.
20. **Романов, Е.Р.** Археологические разведки в Могилевской губернии / Е.Р. Романов // Отдельный оттиск из "Записок Северо-Западного отдела императорского русского географического общества". – Кн. 3. – Вильна, 1912. – С. 3.
21. Свод древнейших письменных известий о славянах. – М., 1995. – Т. II.
22. **Седин, А.А.** Городище Никодимово (Нікадзімава) / А.А. Седин // Slavia Antiqua. Tom. XXVI. – Poznań, 1995. – S. 160.
23. **Седин, А.А.** Новые материалы из городища третей четверти I тыс. н.э. Никодимово/ А.А. Седин // Магілёўшчына. IX выпуск. – Магілёў, 2007. – С. 93.
24. **Седин, А.А.** Оружие из городища Никодимово / А.А. Седин // V абласныя Магілёўскія краязнаўчыя чытанні (28 кастрычніка 1993 г.). – Магілёў, 1994. – С.14-15.
25. **Седов, В.В.** Восточные славяне в VI – XIII вв. – Москва, 1982.
26. **Терпиловский, Р.В.** Ранние славяне Подесенья III – V вв. / Р.В. Терпиловский. – Киев, 1984.
27. **Шмидт, Е.А.** Вооружение и снаряжение воинов-всадников Тушемлинских племен Поднепровья / Е.А. Шмидт // ГАЗ. – 1995. – № 6. – С. 113.
28. Pierwotne siedziby Słowian. – Kraków, 2000.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ДАДАТАК

## Спіс умоўных абазначэнняў


Гумусіраваны пласт


Вугальна-попельная праслойка


Напалены пясок


Вуглі


Пласт шэрага колеру з фрагментамі вугалю і гліняная абмазкі


Камяні


Драўнінны тлен з пяском


Попельная супесь


Попел


Перакоп


Пясок


Гліна


Нівеліровачная адзнака


Рэпер


Знак мацерыка

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 1. Сітуацыйны план даследаванняў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова







Мал. 2. Зачыстка рэшткаў пляцоўкі і вала гарадзішча Змяёўка з паўднёвага боку. Разгорткі профіляў раскопу №1

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 3. Разгортка профіляў, планы знаходак
і ніверліровачныя планы раскопаў №1 і №2

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 4. Траншэя №1. Разгортка профіляў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




**Мал. 5.** Траншэя №1:
1 – план пласта №5, 2 – план пласта №8,
3 – план мацерыка

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




**Мал. 6.** Раскоп №3. Разгортка профіляў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 7. 1 – раскоп №3. План мацерыка,
2 – разрэз жытла, ям, планы печаў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова







Мал. 8. Кераміка кіеўскай культуры III – V стст. н.э.: 1, 2, 3, 5, 6, 7, 9, 10 – гарадзішча "Змяёўка", г. Магілёў;
4, 8 – гарадзішча "Магіла" (парк імя М. Горкага), г. Магілёў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 9. Кераміка калочынскай культуры V – VII стст. н.э.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 10. Кераміка калочынскай культуры V — VII стст. н.э.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




**Мал. 11.** 1–3, 8 – кераміка калочынскай культуры V – VII стст. н.э.; 4–6 – усходнеславянская кераміка, канец X – XIII стст.; 7 – ручка збанка XVII ст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




**Мал. 12.** 1, 2, 4, 5 – бранзалеты (бронза), 3 – кручок.
Калочынская культура V – VII стст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Мал. 13. Вырабы з чорных металаў: 1 – крэсіва-шыла V – VII стст., 2 – нож V – VII стст., 3 – абутковая падкоўка XVII ст., 4 – спражка ад пояса XVII ст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



**Фота 1.** Гарадзішча ў пачатку XX ст.



**Фота 2.** Гарадзішча ў 50-я гг. XX ст.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



**Фота 3**. Гарадзішча. Агульны выгляд з усходу (1973)



**Фота 4**. Гарадзішча. Агульны выгляд з паўночнага ўсходу (1973)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



**Фота 5.** Профіль $АА_1$. Зачыстка рэшткаў пляцоўкі і вала гарадзішча. Выгляд з поўначы (1973)



**Фота 6.** Р№1. Зачыстка мацерыка. Выгляд з поўначы (1973)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



**Фота 7.** Траншэя №1. Змяёўка. Паўночны профіль, квадрат №1, 2. Выгляд з паўднёвага ўсходу



**Фота 8.** Траншэя №1. Змяёўка. Агульны выгляд з захаду. У межах квадрата №4 чытаецца запаўненне паўзямлянкі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



**Фота 9.** Траншэя №1. Змяёўка. Выгляд з паўднёвага захаду.
Квадрат №4, часткова №3



**Фота 10.** Раскоп №3. Змяёўка. Выгляд з паўночнага захаду.
Рабочы момант расчысткі печы-каменкі ў паўзямлянцы №1

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



**Фота 11.** Раскоп №3. Змяёўка. Выгляд з захаду.
Расчыстка паўзямлянкі №1



**Фота 12.** Раскоп №3. Змяёўка. Выгляд з паўночнага ўсходу.
Рабочы момант расчысткі паўзямлянкі №2. Рэшткі печы



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



**Фота 13.** Раскоп №3. Змяёўка. Выгляд з усходу.
Рэшткі печы-каменкі паўзямлянкі №2



**Фота 14.** Раскоп №3. Змяёўка. Выгляд зверху.
Рэшткі печы-каменкі паўзямлянкі №2



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Фота 15.** Рабрысты гаршчок. Калочынская культура V – VII стст. н.э.




Фота 16. 1–2 – бранзалеты (бронза) V – VII стст., 3 – кручок (бронза) V – VII стст., 4 – крэсіва-шыла V – VII стст., 5 – нож V – VII стст., 6 – абутковая падкоўка XVII ст., 7 – спражка ад пояса XVII ст., 8 – "лускавінка", сярэдзіна XVII ст.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




**Фота 17.** 1—2 — кераміка кіеўскай культуры, 3 — фрагмент глінянай абмазкі з катлавана паўзямлянкі V — VII стст., 4 — фрагмент абваленага даху паўзямлянкі V — VII стст., 5 — фрагмент сценкі гаршка V — VII стст.(?)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Фота 18. Кераміка калочынскай культуры V – VII стст. н.э.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




Фота 19. Кераміка калочынскай культуры V – VII стст. н.э.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




**Фота 20.** Кераміка калочынскай культуры V — VII стст. н.э.

Электронный ар… и МГУ имени А.А. Кулешова

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........ 3

Раздзел 1. СТРАТЫГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПОМНІКА ........ 8
1.1. Зачыстка краёў пляцоўкі і вала на паўднёвым баку гарадзішча (1973 г.) ........ 8
1.2. Апісанне стратыграфіі раскопаў (1973 г.) ........ 9
1.3. Агульная характарыстыка стратыграфіі траншэі № 1 (2008 г.) ........ 13
1.4. Агульная характарыстыка стратыграфіі раскопу № 3 (2008 г.) ........ 15
1.5. Апісанне жытла і мацерыковых ям ........ 17

Раздзел II. РЭЧАВЫ ІНВЕНТАР ГАРАДЗІШЧА ........ 20
2.1. Кераміка ........ 20
2.2. Металічныя вырабы ........ 24

ЗАКЛЮЧЭННЕ ........ 27

КАЛЕКЦЫЙНЫ ВОПІС ЗНАХОДАК 1973 г. ........ 31

КАЛЕКЦЫЙНЫ ВОПІС ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ЗНАХОДАК 2008 г. ........ 32

КАЛЕКЦЫЙНЫ ВОПІС ЗНАХОДАК. РАСКОП 3. 2008 г. ........ 33

КАЛЕКЦЫЙНЫ ВОПІС ЗНАХОДАК. ТРАНШЭЯ 1 ........ 35

СПІС МАЛЮНКАЎ І ФОТАЗДЫМКАЎ ........ 36

СПІС КРЫНІЦ І ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ........ 38

ДАДАТАК ........ 40

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Навуковае выданне

**Марзалюк** Ігар Аляксандравіч
**Рыер** Якаў Рыгоравіч

# ГАРАДЗІШЧА ЗМЯЁЎКА (ПЕЛАГЕЕЎСКАЕ ГАРАДЗІШЧА) У МАГІЛЁВЕ. АРХЕАЛАГІЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ

Тэхнічны рэдактар *Г.М. Гладун*
Камп'ютэрная вёрстка *А.Л. Пазнякоў*
Карэктар *Г.В. Цецерукова*

Падпісана ў друк 22.02.2010.
Фармат 60x84/16. Гарнітура FreeSet.
Ум.-друк. арк. 4,0. Ул.-выд. арк. 3,0. Тыраж 100 экз. Заказ № 80.

Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова", 212022, Магілёў, Касманаўтаў, 1.
ЛИ № 02330/278 ад 30.04.04 г.

Надрукавана ў аддзеле аператыўнай паліграфіі
УА "МДУ імя. А.А. Куляшова". 212022, Магілёў, Касманаўтаў, 1.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

к. археологии



# ГАРАДЗІШЧА ЗМЯЁЎКА (ПЕЛАГЕЕЎСКАЕ ГАРАДЗІШЧА) У МАГІЛЁВЕ

Археалагічнае даследаванне

У даследаванні комплексна прааналізаваны матэрыялы, атрыманыя ў выніку археалагічных раскопак гарадзішча Змяёўка, большасць з якіх уведзена ў навуковы ўжытак упершыню. Разлічана на навукоўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і навучэнцаў, краязнаўцаў – усіх тых, хто цікавіцца мінулым Беларусі. Дадзенае даследаванне падрыхтавана ў рамках выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2006–2009 гг. "Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры".



Рыер Якаў Рыгоравіч – доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі УА „МДУ імя А.А. Куляшова"



Марзалюк Ігар Аляксандравіч – доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін УА „МДУ імя А.А. Куляшова"



ISBN 978-985-480-598-6

9 789854 805986

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова